WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЛІПЕНЯ 2010 г. ПЯТНІЦА № 132 (26740)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## БЕЛАРУСЬ ДАСЯГНУЛА ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ Ў АБУЧЭННІ І ПАДРЫХТОЎЦЫ АФІЦЭРСКАГА СКЛАДУ

**Беларусь дасягнула значных поспехаў у абучэнні і падрыхтоўцы ваенных кадраў, аднак сістэму ваеннай адукацыі краіны неабходна пастаянна ўдасканальваць. Аб гэтым учора на прыёме ў гонар выпускнікоў ваенных навучальных устаноў Беларусі і Расійскай Федэрацыі заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Паводле слоў Прэзідэнта, тое, што сёння ў Беларусь едуць на абучэнне ваенныя з іншых краін, сведчыць пра многае. «Неабходна ўсё вышэй і вышэй уздымаць планку абучэння і падрыхтоўкі афіцэраў узброеных сілаў. У адваротным выпадку, да нас абучацца ніхто не прыедзе. Едуць таму, што мы дасягнулі прыкладна ўзроўню Расіі ў абучэнні і падрыхтоўцы афіцэрскага складу, а па нейкіх параметрах і перасягнулі. Трэба і далей дзейнічаць такім чынам. Мы таксама будзем накіроўваць у ваенныя адукацыйныя цэнтры нашых брацкіх дзяржаў сваіх афіцэраў. Але не таму, што не можам сёння самастойна падрыхтаваць гэтых афіцэраў, а для таго, каб захаваць тую сувязь, якая павінна быць паміж брацкімі арміямі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Упершыню выпускнікамі двух факультэтаў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь сталі 15 афіцэраў Узброеных Сілаў Казахстана. «Гэта сведчанне рэзультатыўнасці ўзаемадзеяння нашых краін у ваеннай галіне і эфектыўнага двухбаковага супрацоўніцтва. Думаю, што выбар Беларусі як месца падрыхтоўкі кіруючых кадраў для сваіх узброеных сілаў не выпадковы. Нельга не бачыць, што на нашай зямлі надзейна забяспечаны мір і стабільнасць», — адзначыў беларускі лідар.

Звяртаючыся да афіцэраў Узброеных Сілаў Казахстана — выпускнікоў беларускай Ваеннай акадэміі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Ад'язджаючы на Радзіму, вы возьмеце з сабой часцінку душэўнай цеплыні беларускага народа. Ведайце, што ў Беларусі вы жаданыя госці, а дружба з брацкім народам Казахстана заўсёды будзе з'яўляцца важнейшым фактарам забеспячэння бяспекі нашых краін».

Сёння міжнародная абстаноўка застаецца няпростай і супярэчлівай. Усе мы з'яўляемся сведкамі імкнення да рэвізіі пагадненняў наконт пасляваеннага светаўладкавання, каб дагадзіць геапалітычным інтарэсам асобных дзяржаў. Зніжаецца эфектыўнасць механізмаў забеспячэння міжнароднай бяспекі. Прадаўжаецца трансфармацыя ваенна-блокавых адносінаў. Не спыняюцца канфлікты, што параджаюцца палітычнымі гульнямі прэтэндэнтаў на лідарства.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэты год ускладняецца эканамічнай нестабільнасцю. «Дзяржавы, якія не маюць уласных энергарэсурсаў, вымушаны прыкладаць каласальныя намаганні для забеспячэння сваёй незалежнасці. Спробы дыктату і шантажу сёння робяцца і адносна нашай краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым, падкрэсліў ён, створаная ў Беларусі палітычная і эканамічная мадэль у гэтых умовах дэманструе здольнасць адэкватна рэагаваць на любыя выклікі. Нягледзячы ні на што, Беларусь цвёрда прытрымліваецца курсу добрасуседства і захавання прынцыпаў міжнароднага права ў адносінах паміж дзяржавамі.

Бясспрэчнай з'яўляецца здольнасць нашай дзяржавы нават у складаных умовах забяспечыць дастойны ўзровень жыцця грамадзян, падтрымліваць сацыяльна-палітычную стабільнасць, грамадскую і ваенную бяспеку. «Не сакрэт, што не апошняя роля ў гэтым належыць дзяржаўным органам сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Завяршыўшы фундаментальныя пераўтварэнні ва Узброеных Сілах, мы клапоцімся аб іх далейшым развіцці на якасна новым узроўні, імкнёмся выкарыстоўваць інавацыі ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай сферах. Не зніжаем увагі да пытанняў забеспячэння сілавых структур усім неабходным, знаходзім магчымасці для павышэння ўзроўню сацыяльнай абароненасці ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што будаўніцтва і развіццё Узброеных Сілаў з'яўляецца складаным і бесперапынным працэсам. А таму сённяшнім выпускнікам трэба будзе забяспечваць далейшае інтэнсіўнае нарошчванне баявых магчымасцяў арміі, вырашаць складаныя, адказныя задачы падтрымання баявой гатоўнасці злучэнняў і воінскіх часцей, падрыхтоўкі войскаў, займацца ваенна-навуковай дзейнасцю, абучаць і выхоўваць падначаленых. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нягледзячы на заканчэнне вучобы, расслабляцца выпускнікам нельга. «Вы бачыце, што адбываецца вакол нашай краіны, на граніцы нашай Айчыны. На карце свету з'явіліся новыя незалежныя дзяржавы, у тым ліку Беларусь, і гэтыя дзяржавы запатрабавалі свайго месца пад сонцам. Пройдзе яшчэ нейкі час, і яны стануць у шэрагу ўсіх тых дзяржаў, якія забяспечылі сабе нармальнае становішча ў свеце», — упэўнены Прэзідэнт.

«Выбраўшы шлях абаронцы Радзімы, вы ўзялі на сябе і вялікую адказнасць. Кіраўніцтва краіны, беларускі народ вераць у вас, разлічваюць на вашу энергію, ініцыятыву і высокі прафесіяналізм. Будзьце дастойныя гэтага высокага даверу!» — дадаў Прэзідэнт, звяртаючыся да афіцэраў.

Шэрагу выпускнікоў за выдатныя поспехі ў навучанні і ўзорнае выкананне воінскага абавязку былі ўручаны спецыяльныя лісты аб аб'яўленні падзякі Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў генеральскія пагоны афіцэрам сілавых структур Беларусі. Пагоны генерал-маёра ўручаны начальніку 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Узброеных Сілаў Беларусі Валерыю Гнілазубу. Пагоны генерал-маёра міліцыі атрымалі начальнік упраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама Фёдар Балейка і начальнік упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама Іван Саўчыц. У сваю чаргу начальніку Ашмянскай мытні Івану Нівяркевічу ўручаны пагоны дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу.

## У Беларусі ў 2011 годзе знізіцца падатковая нагрузка на грамадзян

**Аб гэтым паведаміў учора журналістам намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Міхаіл РАСОЛЬКА, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У наступным годзе прадоўжыцца зніжэнне падатковай нагрузкі на грамадзян шляхам павелічэння стандартных вылікаў, якія прымяняюцца пры вылічэнні падаходнага падатку. Так, стандартны падатковы вылік будзе павялічаны з Br270 тыс. у 2010 годзе да Br292 тыс. у 2011 годзе. І прадастаўляцца ён будзе пры заработнай плаце, не вышэйшай за Br1 млн 766 тыс. Сёння гэта граніца ў зарплаце складае Br1 млн 635 тыс. Міхаіл Расолька таксама паведаміў аб запланаваным павелічэнні колькасці некаторых відаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якімі можна займацца без рэгістрацыі (цяпер налічваецца 6 такіх відаў дзейнасці). Прадпрымальнікі будуць выплачваць толькі адзіны падатак і могуць свабодна займацца сваёй прадпрымальніцкай дзейнасцю. Гэта спросціць іх работу з аднаго боку, з другога — зробіць іх бізнэс легальным і павысіць дадатковыя паступленні ў бюджэт. У ліку такіх відаў дзейнасці — музычнае абслугоўванне вяселляў, паслугі тамады, рамонт трыкатажных і футравых вырабаў і некаторыя іншыя віды паслуг.

«Базар-2010»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Васільковыя ноты фестывалю*

## «ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ ВІЦЕБСК!»

**СЁННЯ ў Летнім амфітэатры распачнецца ўрачыстае адкрыццё 19-га міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». «Гаворыць і паказвае Віцебск» — скажуць вядучыя шоу — прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Украіны. Сярод вядучых наша Алена Спірыдовіч. І будзе дадзены старт фестывалю №1 на тэрыторыі былога СССР. І дзякуючы тэлеканалу пакажуць яго ва ўсёй сваёй непаўторнасці.**

Сярод заяўленых «зорак» на канцэрце адкрыцця — Дзмітрый Хварастоўскі, Мікалай Баскаў, Ларыса Доліна, Жасмін, Стас Міхайлаў, Томас Андэрс, «Сябры», «Песняры», Юрый Антонаў...

Дарэчы, сольны канцэрт апошняга ў сераду прайшоў з аншлагам. І як пашкадавалі тыя, хто не паспеў своечасова купіць білеты. Некаторыя спрабавалі іх набыць «з рук» — пры дапамозе «віртуальнага павуціння».

У прыватнасці, на папулярным віцебскім сайце з'явілася такая аб'ява: «Куплю тэрмінова 2 білеты на канцэрт Юрыя Антонава. Добрыя месцы. Цана 300 000 руб. Дзіма (далей указаны тэлефон)». Узорны прыклад цягі да мастацтва. І гэта пры тым, што білет на «добрыя месцы» на канцэрт нашага земляка каштаваў усяго 100 тысяч рублёў (самыя «танныя» — 35 тысяч). Значыць, хлопец не пашкадаваў бы пераплаціць за два білеты ажно столькі.

Між іншым, усяго для продажу надрукавалі 140 тысяч білетаў. Для параўнання: у Віцебску каля 400 тысяч насельніцтва. Білеты па ступені абароны ад падробак параўноўваюць з грашыма. На жаль, і сёлета ну ніяк не змаглі перад «базарам» арганізаваць продаж білетаў праз інтэрнэт. У XXI жа стагоддзі ўжо дзесяць гадоў жывем!

Учора ў Летнім амфітэатры дала канцэрт Алена Ваенга. Яе шлягеры народ любіць. Заўтра — канцэрт майстроў мастацтваў Расіі і праект, прысвечаны Дню Саюзнай дзяржавы, «Дзве сястры — Беларусь і Расія». Праграма фестывалю, як заўсёды, насычаная: тэатр, кіно, вуліцы і плошчы — усюды «базар». Афіцыйна ў рамках фестывалю адбудзецца каля 70 праектаў. А колькі яшчэ, якія паралельна праводзяцца ў горадзе! Каб пастараецца наведаць усе, безумоўна, трэба забыць пра работу, каханых і г.д.

Гараджане, дарэчы, традыцыйна перад пачаткам чарговага фестывалю дзеляцца на дзве «катэгорыі»: тых, каму «базар» дарэмна надакучыў, таму яны стараюцца пры магчымасці пакінуць горад, і «фанатаў» «базару». Гэтыя людзі грошы спецыяльна адкладваюць, каб патраціць менавіта на «базары» і не ўяўляюць сабе: як гэта не прагуляцца па «славянцы» (так у народзе называюць «базар»). А як усядзець дома, калі круглыя суткі нешта адбываецца ў горадзе? Абыякавых да «базару» няма.

У дырэкцыі «базару» і побач з ёй мітусня. Адны адказваюць за тое, каб шыкоўныя лімузіны для «зорак» прыехалі своечасова са сталіцы. Другія ломяць галаву: дзе купіць і прынесці ў нумар дарагі каньяк ці каву канкрэтнага вытворцы. Чаго не зробіш для дарагіх (у прамым і пераносным сэнсе гэтага слова) гасцей!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ДЗІЦЯЧАЯ ВЯСЁЛКА «БАЗАРУ»

**НА ЛЁСАВАННІ ўдзельнікаў міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу фестывальнага «базару» ў Віцебску проста над Летнім амфітэатрам, дзе будуць выступаць пераможцы гэтага конкурсу, пасля дажджу з'явілася вясёлка — вельмі сімвалічны і добры знак. Сімвалізму на дзіцячым «базары» сёлета як, бадай, ніколі раней, шмат. У прыватнасці, нашы зямлячкі — беларускія «зорачкі» — падчас двух дзён конкурсу выступаюць адна за адной.**

**Карэспандэнт «Звязды» яшчэ перад лёсаваннем пажадаў нашым маленькім надзеям удачы на конкурсе.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

**«Прамая лінія»**

### ШТО ЎВАХОДЗІЦЬ У ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ДОМА? ХТО ПАВІНЕН РАМАНТАВАЦЬ ДАХ? КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА, КАЛІ ЖЭУ НЕ РЭАГУЕ НА СКАРГІ?

На ўсе вашы пытанні па працы жыллёва-эксплуатацыйных упраўленняў нашай краіны адкажуць спецыялісты Міністэрства ЖКГ: **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Эдмунд Іосіфавіч ГРЫШКЕВІЧ і начальнік упраўлення эканомікі Алена Іванаўна ДУДЗІНСКАЯ.**

**12 ліпеня з 16.00 да 17.30 задавайце пытанні па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 8 (017) 287 18 29. Пытанні можна пакінуць і загадзя па тэлефоне 8 (017) 287 18 64.**

**Кватэрнае пытанне**

## ЧЭКІ СКАРЫСТАЦЬ МОЖНА, КАЛІ...

**Мы жывём у службовым жылым памяшканні (гэта — індывідуальны жылы дом), пабудаваным сельгасарганізацыяй за кошт ільготнага крэдыту Белаграпрамбанка ў 2007 годзе.**

**Запазычанасць па пагашэнні крэдыту сельгасарганізацыя прапануе перавесці на мужа. Ці зможам мы выкарыстаць на гэта чэкі «Жыллё», якія былі налічаны нам, а таксама падораныя бацькамі?**

**Л. Скварцова,** *Рэчыцкі р-н.*

Перш за ўсё, неабходна адзначыць, што пасля 1 студзеня 2007 г. знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё».

Падпунктам 1.13 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6 вызначана, што грамадзяне і члены іх сем'яў, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, маюць права на індэксацыю чэкаў «Жыллё» для аплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааперативе альбо пагашэння крэдыту (пазыкі), узятага на гэта будаўніцтва, фінансаванне індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднапакаёвых, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам пакупкі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў і пазыках юрыдычных асобаў, узятых і выкарыстаных на названыя мэты.

Грамадзяне маюць права на індэксацыю чэкаў «Жыллё» як налічаных у вызначаным парадку непасрэдна ім, так і атрыманых у выніку дарэння ад мужа (жонкі), бацькоў, дзяцей, усынавіцеляў, усыноўленых, родных братоў і сясцёр, дзеда, бабкі, унукаў (чэкаў, налічаных дарыльшчыку ў вызначаным парадку), атрыманых у спадчыну або па рашэнні суда.

Такім чынам, чэкі «Жыллё» ў вызначаным парадку могуць быць выкарыстаны пры пагашэнні запазычанасці па крэдыце, пераведзенай сельгасарганізацыяй на наймальніка службовага жылога памяшкання. Але пры гэтым неабходна, каб уладальнік чэкаў стаяў на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, а самі чэкі былі перарэгістраваныя.

**Віктар САВІЦКІ.**

## У Мінска будзе 9 гарадоў-спадарожнікаў

Гэта прадугледжана Дзяржаўнай праграмай па будаўніцтве буйных жылых раёнаў для жыхароў Мінска ў гарадах-спадарожніках і вынасу (пераносу) са сталіцы ў населеныя пункты рэспублікі вытворчых аб'ектаў. У якасці гарадоў-спадарожнікаў Мінска ў дзяржпраграму ўключаны: прамысловыя — Дзяржынск, Жодзіна, Фаніпаль; аграпрамысловыя — Смалявічы, Стоўбцы, Узда, Рудзенск; турысцка-рэкрэацыйныя — Заслаўе, Лагойск.

**БЕЛТА.**

**Грошы**

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ — 11,5 ПРАЦЭНТА ГАДАВЫХ

**Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка зноў будзе зніжаная на 0,5 працэнта: з 14 ліпеня яе ўзровень складзе 11,5 працэнта гадавых, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.**

Як адзначаюць у Нацбанку, стаўка зніжаецца на фоне ўмацавання пазітыўных тэндэнцый у эканоміцы і фінансавай сферы краіны. І дадаюць: што чарговае яе змяншэнне дазволіць узмацніць тэндэнцыю зніжэння ставак па банкаўскіх крэдытах, якія даюцца насельніцтву і суб'ектам эканомікі, што стане дадатковым стымулам да ўзнаўлення высокіх тэмпаў эканамічнага росту ў краіне. Акрамя таго, у Нацбанку падкрэсліваюць, што нягледзячы на зніжэнне стаўкі рэфінансавання, умовы па рублёвых укладах насельніцтва, якія прапануюцца банкамі, па-ранейшаму забяспечаць больш высокую даходнасць у параўнанні з дэпазітамі ў замежнай валюце і ўзроўнем інфляцыі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ПРЕДЛАГАЕМ В АРЕНДУ в п/у Колядичи

СКЛАДСКИЕ ПОМЕЩЕНИЯ

по ставке от 3,5 евро/кв. м.

*Удобные подъезды, охраняемая территория с кафе.*

Тел.: 8 029 679 24 79.

УНП 690306997.

**Важны кожны**

## НАВОШТА НАС ПЕРАПІСВАЛІ?

**У НАЦЫЯНАЛЬНЫМ статыстычным камітэце ідзе напружаная работа па апрацоўцы звестак перапісу, які прайшоў у кастрычніку 2009 года пры тэхнічнай падтрымцы Фонду ААН у галіне народанасельніцтва. На пачатку наступнага года будуць атрыманы першыя звесткі, якія пакажуць, наколькі якаснымі яны з'яўляюцца. Традыцыйна гэта менш за 1 працэнт.**

На сёння статкамітэт цалкам забяспечыў увядзенне персанальных звестак у камп'ютарную сістэму. Размова ідзе пра 13 мільёнаў перапісных лістоў. У гэту лічбу ўваходзяць 9,5 мільёна чалавек насельніцтва і 3,7 мільёна жылых памяшканняў — пакоі, кватэры, дамы, — інфармацыя пра якія таксама збіралася ў межах апошняй перапіснай кампаніі. З 1 ліпеня пачаўся кантроль усёй інфармацыі, атрыманай ад рэспандэнтаў.

Як паведаміла ЮНФПА **намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, начальнік упраўлення перапісу насельніцтва Святлана НАВАСЁЛАВА,** няякаснай інфармацыі звычайна бывае крыху больш хіба па пытаннях занятасці — 5—10 працэнтаў. Гэта звязана, напрыклад, з тым, што многім цяжка было адказаць на пытанне пра від эканамічнай дзейнасці прадпрыемстваў і арганізацый, у якіх яны працуюць.

Наогул звыш 600 лагічных кантроляў, якія будуць выкарыстоўвацца спецыялістамі, дазволяць вылавіць любую сумнiўную інфармацыю. Дапусцім, у анкеце ёсць такая інфармацыя: поўных гадоў — 7, год нараджэння — 1983, ёсць дзеці. Пасля аналізу ўсяго ліста ў цэлым спецыялісты маюць права адкарэктаваць узрост на 27. Дарэчы, у адзінкавых выпадках дзеля ўдакладненняў да рэспандэнтаў даводзілася звяртацца паўторна.

Звесткі перапісу, безумоўна, адрозніваюцца ад звычайнай дэмаграфічнай статыстыкі. Так, у межах апошняй улічваецца толькі колькасць пар, якія афіцыйна зарэгістравалі адносіны ў ЗАГСе. Перапіс жа пакажа, колькі людзей пражывае разам фактычна, паколькі грамадзянскі шлюб сёння вельмі папулярны. Больш за тое, стане відавочным, у якіх рэгіёнах гэта тэндэнцыя найбольш выражана, якая сярэдняя ўзроставая група такіх людзей. Аналагічна і з разводамі — людзі могуць лічыцца ў шлюбе, а пражываць асобна.

Больш стане звестак і пра беспрацоўе. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны валодае толькі звесткамі, заснаванымі на інфармацыі цэнтраў занятасці. А, як вядома, далёка не ўсе беспрацоўныя становяцца на дзяржаўны ўлік. Высветліцца і тое, за кошт каго фарміруюцца працоўныя рэсурсы Беларусі — карэннага ці заезжага насельніцтва.

Для апрацоўкі і прадастаўлення звестак перапісу-2009 будзе прымяняцца тэхналогія Геаграфічнай Інфармацыйнай Сістэмы. ГІС дазваляе наглядна, з дапамогай каляровай гамы ўбачыць на электронных картах кожны населены пункт, раён і нават кварталы гарадоў, колькасць і шчыльнасць насельніцтва там. Такая інфармацыя можа выкарыстоўвацца для складання, напрыклад, маркетынгавых і бізнэс-планаў. Так, для будаўніцтва гіпермаркетаў важна ведаць, колькі людзей пражывае ў раёне запланаванага адкрыцця. Такая інфармацыя карысная і ў рабоце службаў МНС, кампаній, якія прадастаўляюць паслугі сувязі. Размешчаныя на картах дэмаграфічныя паказчыкі могуць выкарыстоўвацца гарадскімі службамі пры планаванні будаўніцтва паліклінік і дзіцячых садкоў, транспартнымі службамі — пры размеркаванні транспартных патокаў, прадпрымальнікамі — падчас прыняцця рашэнняў аб месцы і маштабах размяшчэння новых магазінаў або сэрвісных службаў і г.д.

Як адзначае **начальнік аддзела народанасельніцтва, гендэрнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА,** статыстычныя звесткі, у тым ліку атрыманыя падчас перапісу, бяруцца пад увагу пры распрацоўцы сацыяльна-эканамічных праграм. Так, падчас распрацоўкі апошняй Праграмы дэмаграфічнай бяспекі на ўзбраенне была ўзятая інфармацыя аб амаль 60 працэнтах беларускіх сем'яў, якія выхоўваюць адно дзіця. Адпаведна, у гэтай праграме прасочваецца ўхіл у бок заахвочвання нараджэння другога і наступных дзяцей. У прыватнасці, былі дыферэнцаваныя памеры дапамог на дзяцей: памер дапамогі на другое дзіця быў большы, чым на першае. Мяркуецца, што і надалей практыка ўмацавання дэмаграфічнай сітуацыі будзе абапірацца на стварэнне неабходных для нараджэння другога дзіцяці ўмоў — наяўнасць у сям'і жылля, дастойны ўзровень заробку, падтрымка дзяржавы і інш. Мяркуецца прадугледзець у новым дакуменце і павышэнне агульнага ўзроўню дзіцячых дапамог.

Падчас мінулага перапісу была выяўлена і досыць істотная распаўсюджанасць пражывання пар без рэгістрацыі шлюбу. Цікава, што жанчыны лічаць сябе пры гэтым «замужнімі», а мужчыны — «свабоднымі». Можна меркаваць, што падобная тэндэнцыя выявіцца і ў працэсе аналізу звестак леташняга перапісу. А значыць, Мінсацабароны паспрабуе ўлічыць гэты момант у новых праграмах — каб актывізаваць тэндэнцыю да рэгістрацыі шлюбу.

Пры садзейнічанні Фонду ААН у галіне народанасельніцтва другая палова 2010 і частка 2011 года пройдуць пад эгідай навучання асноўных карыстальнікаў — дзяржструктур і міністэрстваў — рабоце са звесткамі перапісу-2009. Ва ўсім свеце вынікі перапісу, у прыватнасці, карты з нанесенымі вынікамі, карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў шырокіх пластоў насельніцтва. У першую чаргу, вядома, у складальнікаў дзяржаўных праграм, палітыкаў і бізнэсменаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МВФ ПАДНЯЎ ПРАГНОЗ РОСТУ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ

**Міжнародны валютны фонд павысіў прагноз эканамічнага росту ў свеце ў 2010 годзе з 4 да 4,5 працэнта. Пра гэта паведамляецца ў чарговым дакладзе аб перспектывах развіцця глабальнай эканомікі. У асноўным рост будзе забяспечаны за кошт пад'ёму ў краінах Паўднёвай і Усходняй Азіі, які працягваецца.**

У той жа час МВФ разлічвае, што развіцця эканомікі прадэманструюць сярэднія паказчыкі пад'ёму. Тут сярод асноўных прычын называюцца новыя пагрозы фінансавай стабільнасці.

### ДАСЛЕДЧЫКІ ПАДЛІЧЫЛІ ПАМЕР СЯРЭДНЯГА РАСІЙСКАГА ХАБАРУ



**Сярэдні памер хабару ў Расіі вырас амаль у тры разы і дасягнуў 27 тысяч рублёў, падлічыла інтэрнэт-бібліятэка Public.Ru, якая правяла даследаванне карупцыйнай тэмы па матэрыялах больш як 1500 друкаваных цэнтральных і рэгіянальных СМІ з уласных фондаў. Акрамя таго, даследчыкі склалі пералік самых гучных фактаў хабарніцтва ў рэгіёнах РФ, якія шырока абмяркоўваліся ў сродках масавай інфармацыі ў першым квартале 2010 года, піша агенцтва REGNUM.**

Хабар чыноўніку павышаецца ад адной мільёна рублёў. На чыноўнікаў прыпадае 65 % узгадванняў пра хабар у цэлым. У 10 % паведамленняў гаворыцца пра хабары супрацоўнікам ДІБДД, супрацоўнікі міліцыі фігуравалі ў 8 % публікацый, работнікі адукацыі і аховы здароўя атрымалі па 5 % увагі, аддадзенай пытанню хабару. Судовыя прыставы ўзгадваюцца ў 4 % прыведзеных фактаў. Радзей за іншых журналісты пішуць пра хабарніцтва сярод адвакатаў і пажарных — 2 % і менш за 1 % адпаведна.

### У ЭСТОНІІ ПАЧАЎСЯ «ПАХОД У ПЕКЛА»

**Раніцай 8 ліпеня ў Пярнускім павеце Эстоніі (на паўднёвым захадзе краіны) пачалася ваенна-спартыўная гульня Porgupohja retk («Паход у пекла»), паведамляе Postimees. Яна прысвечана барацьбе «лясных братоў» супраць савецкай улады.**

Назву гульня атрымала па назве бункера «лясных братоў» Porgupohja («Пекла»), які праіснаваў да 1947 года, а затым быў знішчаны савецкімі вайскоўцамі.

Гульня будзе праходзіць на працягу трох дзён на тэрыторыі Пярнускага і суседняга Рапласкага паветаў. Удзельнікі павінны будуць пераадолець 80 кіламетраў, выконваючы пры гэтым розныя заданні (стральба, разведка, праверка ведання лекавых раслін і іншае).

Запланавана таксама «рэканструкцыя» абрабавання цягніка, учыненага ў 1951 годзе. Тады група «лясных братоў» падарвала чыгуначнае палатно, каб спыніць састаў, адзін з вагонаў якога перавозіў грошы.



Арганізатары гульні адзначаюць, што яна нагадвае пра «барацьбу супраць акупантаў» і дазволіць «перадаць маладым уменне весці партызанскую вайну».

Гульня «Паход у пекла» праходзіць у Эстоніі ўжо некалькі гадоў запар.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.07.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 009,00 | 1 чэшская крона | 149,34 |
| 1 еўра | 3 804,88 | 1 польскі злоты | 932,40 |
| 1 латвійскі лат | 5 371,30 | 1 расійскі рубель | 97,23 |
| 1 літоўскі літ | 1 102,54 | 1 украінская грыўня | 380,55 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,9479 |
| 10 UAH | 39,1448 |
| 1000 BYR | 10,2646 |
| EUR | 39,1615 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

## ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

### ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ НОВЫХ (ПОВТОРНЫХ) ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ»

**Лот № 1.** Капитальное строение (заводоуправление) с инв. № 500/С-6419, общей площадью 78,0 кв. м, 1950 года постройки, количество этажей — 1, расположенное в г. Минске по пр. Машерова, 15, окончательной стоимостью с учетом НДС 231 992 838 (Двести тридцать один миллион девятьсот девяносто две тысячи восемьсот тридцать восемь) белорусских рублей.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by.**

**Торги состоятся 27.07.2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Каминская В.Г., тел./факс: 294 93 65, 8 029 177 32 45**

**ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % стоимости имущества в размере 11 599 642 белорусских рубля.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

# У БЕЛАРУСІ ВЫБРАЛІ «ЛЮДЗЕЙ СПРАВЫ»

**Рэдакцыя часопіса «Дело» выбрала пераможцаў у сваёй штогадовай прэміі «Чалавек Справы». Сёлета конкурс праводзіўся ў юбілейны, 15-ы, раз, заявак на ўдзел у 12 намінацыях было пададзена як ніколі шмат — сто дзесяць.**

— Кажуць, што перамены ў бізнэс-клімаце адбываюцца ва ўсім свеце. Не скажу за ўвесь свет, але за Беларусь ручаюся — гэта факт: бізнэс-клімат мяняецца, ён становіцца больш цёплым, — лічыць **Віктар Жук, галоўны рэдактар часопіса «Дело».** — Сёлета выканкамы, міністэрствы эканамічнага блока, прадпрымальніцкія саюзы вылучылі на конкурс 110 чалавек, гэта проста рэкорд, бо папярэднія 14 гадоў звычайна было 70—80 кандыдатаў. Вельмі прыемна таксама, што сёлета шмат пераможцаў з рэгіёнаў

Званне «Чалавек Справы» атрымалі наступныя прадстаўнікі дзелавых колаў Беларусі: за стабільную і эфектыўную працу на беларускім і замежным рынку — **генеральны дырэктар ААТ «Белмагістральаўтатранс» Мікалай ГОРБЕЛЬ,** за павышэнне прэстыжу маркі «Зроблена ў Беларусі» — **генеральны дырэктар РУП «Магілёўліфтмаш» Анатоль ЦЮКАЎ,** за стварэнне высокаэфектыўнай, адпаведнай сусветным стандартам, сеткі гіпермаркетаў «ProStore» — **дырэктар СЗАТ «ПрастирМаркет» Інэса ЗАХАРЭВІЧ,** за важкі ўнёсак у развіццё знешнеэканамічных сувязяў Беларусі — **заснавальнік і дырэктар СТАА «Контэ СПА» Валянцін БАЙКО,** за значнае павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і экспартных паставак айчыннай прадукцыі ва ўмовах крызісу — **дырэктар ААТ «Бархім» Яўген РУДЫ,** за бездакорныя паводзіны ў няпростых рынкавых сітуацыях — **кіраўнік касметычнага салона класа люкс «Лэдзі Гадзіва» Таццяна АВЯР'ЯНАВА,** за істотны ўнёсак у развіццё будаўнічага бізнэсу ў Беларусі — **генеральны дырэктар ВРУП «Беларускі цэментны завод» Уладзімір КІСЯЛЁЎ,** за стварэнне прадпрыемства, якое падае прыклад пераходу на інавацыйны шлях развіцця — **дырэктар ТАА «Мемпэкс» Віктар МАІСЕЕЎ,** за актыўнае садзейнічанне развіццю аграрнага сектара Беларусі — **дырэктар ААТ «Бярозаўскі мясакансервавы камбінат» Уладзімір ЖУКОВІЧ,** за актыўны ўдзел у развіцці фінансавага рынку краіны — **дырэктар ЗАТ «Банкаўска-фінансавая тэлесетка» Дзмітрый ПАХОМАЎ,** за самую арыгінальную бізнэс-ідэю, якую ажыццявіў айчынны прадпрымальнік, — **старшыня праўлення спажывецкага кааператыва «Сталічны клуб узаемадапамогі» Алена КАЛЯДА.**

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Тэніс. Кубак Дэвіса

## «АРАНЖАВАЕ АДЦЕННЕ» БЕЛАРУСКАГА ТЭНІСА

**Сёння на кортах сталічнага Палаца тэніса ў рамках Кубка Дэвіса пачнецца матч 1-й Еўра-Афрыканскай групы паміж зборнымі Беларусі і Галандыі.**

У мінскай гарадской ратушы, дзе традыцыйна прынята праводзіць гэтае мерапрыемства, у вачах мітусілася ад ужо знаёмага колеру — на матч Кубка Дэвіса, ад якога залежыць, ці застанецца ў беларускіх тэнісістаў прапіска 1-й групы альбо прыйдзецца ўдзельнічаць яшчэ ў адным матчы на выбыванне, прыехала некалькі дзясяткаў журналістаў. Першымі на сталічны корт у 10.00 па мясцовым часе выйдуць лідар галандцаў Цімо Дэ Бекер, які ў бягучым рэйтынгу Міжнароднай тэніснай асацыяцыі займае высокае 41-е месца, і другі нумар беларусаў Андрэй Васілеўскі — у яго паводле рэйтынгу ATP tour толькі 720-ы радок. У другім пятнічным двубоі сустрэнуцца надзея беларускага тэніса Уладзімір Ігнацік (188-я пазіцыя) і Робін Хаазе (140-е месца). На суботу запланавана парная сустрэча: Максім Мірны—Аляксандр Буры (11-е і 633-е месца ў бягучым парным рэйтынгу адпаведна) і Есі Хута Галунг—Ігар Сейслінг (316-е і 239-е месцы). Гульня таксама пачнецца ў 10.00. Заключны дзень тэніснага турніру — нядзеля. Пачаргова пройдуць сустрэчы Ігнацік—Дэ Бекер і Васілеўскі—Хаасе.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

# ДЗІЦЯЧАЯ ВЯСЁЛКА «БАЗАРУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Маленькія ўдзельніцы і ўдзельнікі такія шчырыя, такія адкрытыя, саромеюцца. Ну, звычайныя дзеці, толькі з вялікім талентам, які старанна шліфуюць іх педагогі.

Упершыню сёлета дзіцячы конкурс адбудзецца яшчэ да афіцыйнага адкрыцця «базару». І добра прыдумалі, каб не змяшаўся ў «міксеры» шматлікіх фестывальных падзей.

Але, як запэўнілі ў дырэкцыі «базару» імя пераможцы дзіцячага конкурсу будзе вядома толькі ў суботу падчас гала-канцэрта міжнароднага дзіцячага конкурсу «Віцебск-2010». І летась, дарэчы, захоўвалася інтрыга да апошняга.

Лёсаванне праводзілася ў дырэкцыі фестывалю, у вялікім памяшканні, дзе арганізуюцца прэс-канферэнцыі з «зоркамі» эстрады. Удзельнікі спачатку выцягвалі па блакноце з нумарам унутры (ён адзначаў чаргу выступлення на першым конкурсным дні), а потым флэшку на памяць аб фестывалі, і, уставіўшы флэшкі ў камп'ютар, на вялікім экране бачылі лічбу — чаргу выступлення на другім конкурсным дні.

Мо хто з гэтых маленькіх хлопчыкаў і дзяўчынак праз гадоў 15—20 стане на «базары» госцем чарговай журналісцкай «зорнай гадзіны»?!

22 юныя прадстаўнікі і прадстаўніцы з 19 краін ва ўзросце ад 7 да 12 гадоў змагаюцца за Гран-пры (ажно 5 тысяч долараў). Беларусь прадстаўляюць дзве дзяўчынкі: 11-гадовая Злата Ларчанка — лаўрэат нацыянальных музычных конкурсаў Беларусі і 9-гадовая Ганна Зайцава — уладальніца першай прэміі мінскага вакальнага конкурсу эстраднай песні «Зімовы калейдаскоп».

У першы дзень конкурсу Злата выступала пад № 8, Ганна — пад № 9, у другі конкурсны дзень — Ганна спявае шостай, Злата — сёмай. Дарэчы падчас нашай размовы перад лёсаваннем Злата прызналася, што менавіта сем — яе любімая лічба. І бачылі б вы, як яна пры ўсіх — членах журы, журналістах, прадстаўніках дырэкцыі — скакала ад радасці, калі лёс падарыў ёй выступленне пад нумарам 7!

— Я люблю лічбу 7. І хацела б выступаць сёмай. У гэты дзень нарадзіўся Хрыстос (каляды святкуюцца 7-га), — расказвае Злата Ларчанка. — Што мяне цікавіць, акрамя спеваў? Пішу песні. Выканаю на базары песню пра Бабу Ягу. А яшчэ вельмі люблю сабак, іх у мяне два дома. Я — салістка Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна. Жыву ў Дзяржынскім раёне ў былым ваенным пасёлку Станькава.

— Дарэчы, Злата прыязджае адтуль на рэпетыцыі некалькі разоў у тыдзень. Вельмі старанна займаецца вакалам. Нядаўна вярнулася з Феадосіі, дзе атрымала перамогу на фестывалі «Крымскія хвалі», — расказвае заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Святлана Стацэнка — мастацкі кіраўнік эстраднай студыі. — Выйграла больш чым у сарака прэтэндэнтаў. Пытаеце, дзе Ксенія Сітнік? Яна вельмі шкадуе, што не трапіць сёлета на свой самы любімы фестываль, бо ў Оксфардзе падцягвае веданне англійскай мовы. А раптам запросяць весці Еўрабачанне? Вучыцца ў лінгвістычнай гімназіі, але знаходжанне ў краіне, дзе можна гутарыць з носьбітамі мовы, пагадзіцеся, вельмі карыснае.

— А я люблю лічбы 5 і 3, — расказвае Ганна Зайцава. Яна вядомая гледачам тэлеканала «Лад» як вядучая перадачы «Свая кампанія». — 5-га кастрычніка я нарадзілася. А 3 — проста прыгожая лічба. Я вучуся ў Мінску, з чатырох гадоў займаюся ў студыі вакалу «Нясумны ўзрост» пад кіраўніцтвам Наталлі Сухамліной.

Хочацца ад душы пажадаць поспехаў нашым юным спявачкам. Канкурэнты ў іх вельмі моцныя.

Журы дзіцячага конкурсу сёлета ўзначальвае **кампазітар з Румыніі Мікалае КАРАЖЫА.** Ён разам з калегамі з журы шчыра апладзіравалі канкурсантам, якія па чарзе падчас лёсавання праспявалі па куплеце сваёй любімай песні. І, вітаючы ўдзельнікаў конкурсу, адзначыў, што ўзровень усіх «зорачак» на фестывалях заўсёды высокі і не трэба перажываць у выніку пройгрышу.

Фестываляў у гэтых маленькіх талентаў будзе яшчэ нямала. Як і такіх вельмі сімвалічных вясёлак, на якіх многія дарослыя ў мітусні мо і не звернуць увагі. Чытачы, будзем хварэць за нашых!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Абзац

◢ **Міжземнаморская гарачыня чакаецца ў Беларусі на наступным тыдні, папярэджваюць сіноптыкі. Яе на тэрыторыю краіны прынясе ўжо ў гэтыя выхадныя Азорскі цыклон. У дзённы час на наступным тыдні нам абяцаюць 27—32 градусы, месцамі — да 34.**

◢ Салігорск, Вілейка і Нясвіж прызнаныя самымі добраўпарадкаванымі гарадамі Мінскай вобласці па выніках мінулага года. Яны сталі лепшымі па выніках агляду-конкурсу санітарнага стану і добраўпарадкавання, у якім прымалі ўдзел 45 населеных пунктаў.

◢ **ДАІ Мінскай вобласці ўзмацніла кантроль за захаваннем правілаў дарожнага руху. У прыватнасці, узмоцнены кантроль за хуткасным рэжымам. Прымяняюцца цывільныя аўтамабілі, аснашчаныя прыборамі «Іскра», «Арэна» і «Візір». На некаторых участках устаноўлены стацыянарныя прыборы з фотакамерамі. ДАІ нагадвае, што за перавышэнне хуткасці больш чым на 10 км/г штраф складае Br35 тыс., больш чым на 20 км/г — Br70 тыс., а звыш 30 км/гадз — Br350 тыс.**

◢ Арэндныя жылыя дамы з'явяцца ў Мінску, паведаміў учора старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька на пасяджэнні мэрыі. Такое жыллё мяркуюць пачаць будаваць налета. Яно будзе здавацца ў арэнду «па разумных цэнах» медработнікам, настаўнікам і іншым спецыялістам з мэтай замацавання кадраў. Уладальнікамі арэндных дамоў могуць выступаць як дзяржава, так і буйныя кампаніі, прыватныя асобы, некамерцыйныя арганізацыі.

◢ **З тэрыторыі Магілёўскага аўтамабільнага завода (філіял РУВП «БелАЗ») тры работнікі прадпрыемства ў працоўны час скралі ліставы метал коштам больш чым Br32 млн. Згаварыўшыся, зламыснікі скралі каля 12 т ліставога металу, пагрузілі яго ў МАЗ і праз пост аховы вывезлі за межы завода. Заведзена крымінальная справа. Рабочы, што арганізаваў пагрузку, арыштаваны, у дачыненні кантралёра аховы і вадзіцеля ўзятыя падпіскі аб нявыездзе.**

◢ Памежнікам на пункце пропуску «Бенякoні» на беларуска-літоўскай мяжы давялося практычна разабраць тры легкавыя аўтамабілі, каб знайсці кантрабандныя цыгарэты. Ва ўсіх трох выпадках цыгарэты павінны былі трапіць на тэрыторыю Еўрасаюза і там знайсці свайго пакупніка. Іншамаркі Citroen, Volkswagen и Renault былі літаральна нашпігаваныя пачкамі цыгарэт. У выніку памежнікі спынілі кантрабанду звыш 40 тыс. цыгарэт з беларускімі і ўкраінскімі акцызнымі маркамі агульным коштам больш за Br13 млн.

◢ **Кіраўнік адной з дзяржаўных устаноў Віцебска адрамантаваў кватэру, незаконна прыцягваючы да працы сваіх падначаленых. Двое супрацоўнікаў дзяржустановы фактычна не з'яўляліся на працоўным месцы больш за два месяцы. Іх «прагулы» санкцыянаваў дырэктар. Пры гэтым працаўнікі спраўна атрымлівалі зарплату па месцы працы ў дзяржструктуры, якая фінансуецца з бюджэту. Заведзена крымінальная справа.**

## Поўны абзац

◢ Грузавік, які перавозіў каля 2 мільёнаў еўра, перакуліўся на шашы на поўдні Італіі. У выніку ДТЗ у грузавіка пашкодзіўся кузаў, і манеты наміналам 1 і 2 еўра, якія ў ім знаходзіліся, высыпаліся на дарогу. Да прыезду паліцыі кіроўцы, якія праязджалі міма перакуленага грузавіка, забралі з месца здарэння каля 10 тысяч еўра. У выніку ДТЗ кіроўца грузавіка і адзін з яго пасажыраў атрымалі траўмы. Грузавік, які перакуліўся, перавозіў наяўныя з Манетнага двара і аддзяленняў мясцовых банкаў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***



РАМОНКІ ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ раздавалі ў Мінску

Фота БЕЛТА.

## Пацярпела маёмасць сотавых аператараў

**Толькі гузік знайшлі на месцы злачынства міліцыянеры, якія разбіраліся з крадзяжом абсталявання аднаго з сотавых аператараў.**

Невядомаму злодзею спатрэбіўся блок электрасілкавання «РВС» з базавай станцыі. Ён падабраў ключ і ноччу пранік на яе тэрыторыю каля вёскі Лагвошчы ў Жыткавіцкім раёне. Выкрадзенае абсталяванне каштуе больш за 4 мільёны рублёў. Напад на базавую станцыю іншага сотавага аператара адбыўся таксама ўначы. У Калінкавіцкім раёне ля вёскі Даманавічы невядомы выкраў бензагенератар «KIPOR-KGE-6500e» і іншае спецыфічнае абсталяванне — на суму 2,5 млн рублёў. Можа, нейкі «Кулібін» збіраецца стварыць канкурэнцыю вядомым сотавым аператарам?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Падрабязнасці

## ВЫБУХ У МІРНЫ ЧАС

**Як паведамлялася, 18-гадовы жыхар Смаргоні загінуў ад выбуху, які адбыўся ў бліндажы часоў Першай сусветнай вайны.**

Няшчасце адбылося каля 10 гадзін вечара паблізу вёскі Крэва Смаргонскага раёна. Смерць наступіла ад вострай страты крыві, выкліканай пашкоджаннем аскепкам шыйнай артэрыі. Яшчэ восем маладых людзей ва ўзросце ад 17 да 23 гадоў, якія знаходзіліся паблізу вогнішча, атрымалі цялесныя пашкоджанні рознай ступені цяжкасці.

На наступны дзень, як паведамілі ў службе інфармацыі пракуратуры Гродзенскай вобласці, на месца здарэння прыбыла сапёрная група воінскай часці ўпраўлення заходняга аператыўнага камандавання, першы намеснік пракурора вобласці і следчы-крыміналіст абласной пракуратуры. Спецыялісты ўстанавілі, што ў бліндажы ўзарваўся снарад калібру 76 мм часоў Другой сусветнай вайны. Снарад, як мяркуецца, 18 чэрвеня знайшлі паблізу могілак каля вёскі Крэва і прынеслі ў бліндаж мясцовыя жыхары 1989 і 1992 года нараджэння. Каб узарваць, кінулі знаходку ў вогнішча, якое па волі лёсу затухла...

6 ліпеня ўвечары там вырашыла адпачыць кампанія маладых людзей. Яны, на жаль, нават і не падазравалі аб наяўнасці снарада. Распалілі на гэтым месцы агонь, і адбыўся выбух...

Сапёрна-піратэхнічная група абследавала тэрыторыю, якая прылягае да бліндажу, і знайшла ў зямлі і знішчыла яшчэ 5 аналагічных снарадаў і 1 снарад калібру 122 мм. Пракуратура Смаргонскага раёна завяла крымінальную справу за незаконнае дзеянне ў дачыненні агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў, а таксама за нанясенне смерці па неасцярожнасці. Зараз ідзе расследаванне.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Участковы міліцыянер цяжка параніў з пісталета жыхарку Рагачоўскага раёна

**У вёсцы Доўск Рагачоўскага раёна ўчастковы інспектар РАУС, знаходзячыся ў службовым аўтамабілі, стрэлам з табельнай зброі цяжка параніў 22-гадовую мясцовую жыхарку. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.**

Інцыдэнт адбыўся 6 ліпеня каля 23.00. У цяперашні час пацярпелая знаходзіцца ў бальніцы, яе стан ацэньваецца як крытычны. Паводле папярэдняй інфармацыі, выстрал адбыўся выпадкова. Разам з тым першапачатковая праверка ўжо вызначыла, што прафесійная падрыхтоўка ў райаддзеле не была арганізавана на належным узроўні, з супрацоўнікамі, якія заступалі на службу, не заўсёды праводзіліся штодзённыя інструктажы.

«Гэта трагедыя для сям'і пацярпелай і сапраўдная ганьба для ўсёй сістэмы органаў унутраных спраў», — пракаментаваў сітуацыю намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі Анатоль Курылец. Ён дадаў, што Гомельскай абласной пракуратурай заведзена крымінальная справа па ч. 1 арт. 14 «Замах на злачынства» і арт. 139 «Забойства» КК. Справа знаходзіцца на асабістым кантролі ў кіраўніка МУС. Супрацоўнік міліцыі ўжо затрыманы.

Як адзначыў Анатоль Курылец, гэта трагічны, але адзінкавы выпадак. Сістэма службовай падрыхтоўкі супрацоўнікаў міліцыі, якія часта знаходзяцца ў стрэсавай сітуацыі, ужо даўно не давала такіх збояў. Дзеянням службовых асобаў, якія мелі да гэтага дачыненне, па выніках праверкі галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС ужо ў бліжэйшыя дні будзе дадзена ацэнка.

**Кар. БЕЛТА.**

Пытальнік

# ЦІ МОЖНА ЗРАБІЦЬ СУСЕДСТВА ДЗІКОЎ І ЛЮДЗЕЙ БЯСШКОДНЫМ ДЛЯ АПОШНІХ?

**Я ШМАТ гадоў выпісваю «Звязду» і чытаю, як вы дапамагаеце вырашаць праблемы. Дапамажыце і мне. У мяне дзікі вырылі ўсю бульбу, і палова агарода зараз стаіць пустая. А я ж яго засявала, палола, толькі жукоў патравіла. А яны прыйшлі і ўсё павырывалі. Я падавала заяву ў сельскі Савет — старшыня кажа, што яго ніхто слухаць не хоча. Тэлефанавала ў райвыканкам, мне сказалі, што будуць разбірацца, а мой агарод як стаяў пусты, так і стаіць. І хто за гэта заплаціць? Мне кажуць, што трэба агарод абгарадзіць. А чым? Маленькі агародчык яшчэ можна, а як вялікі?**

**Ніна Андрэеўна ГАСПАДАРЫК,** *вёска Барань Барысаўскага раёна.*

Як паведамілі нам у сектары пісьмаў і зваротаў грамадзян Барысаўскага райвыканкама, ніякіх пісьмовых зваротаў ад грамадзянкі наконт патраў дзікамі яе агарода сюды не паступала. Магчыма, яна тэлефанавала дзяжурнаму? Тым не менш канкрэтны факт пацвердзіўся — са слоў работнікаў сельскага Савета: у заяўніцы дзікі разрылі палову агарода. Акт адносна патраў жыхарка вёскі атрымае ў бліжэйшыя дні. Потым ёй давядзецца самастойна прад'яўляць прэтэнзіі (патрабаваць кампенсацыі, як мы зразумелі) ад арандатара ўгоддзяў — паляўнічай гаспадаркі «Каралеўскае паляванне» ААТ «Барысаўскі мясакамбінат». Дарэчы, апошняе на ранейшыя аналагічныя скаргі адказвала, што калі людзі самастойна будуць прадпрымаць нейкія меры (напрыклад, адстрэл), гэта можа каштаваць ім адказнасці. Маўляў, мы самі і падкормачныя пляцоўкі для дзікоў уладкоўваем, і самі ж вядзем адстрэл. Між тым, наколькі мы зразумелі з адказу, дзікі ў гэтых мясцінах пачуваюць сябе дастаткова прывольна. Людзям жа рэкамендавана агароджваць свае агароды. Заўвага, з аднаго боку, слушная. А з другога? Як быць чалавеку, калі гаворка, як справядліва піша чытачка, ідзе пра вялікія плошчы? Такая агароджа павінна быць да таго ж трывалай, таму каштаваць будзе нямала. І як вырашыць гэтую праблему, каб і прадпрыемства свой прыбытак мела, але ж і вяскоўцы ад такога суседства не цярпелі, не неслі страты? Рытарычнае пытанне?..

Да слова, прыгадалі нам у райвыканкаме, летась праблема патраў сельскагаспадарчых культур дзікамі пасля калектыўнага звароту людзей разглядалася на ўзроўні аблвыканкама. У прыватнасці, сваю незадаволенасць выказалі жыхары вёсак Ганцавічы, Іканы, Вішнёва. Аднак праведзеная на месцы праверка засведчыла, што насамрэч меў месца толькі адзін выпадак патраў, прычым не такіх ужо і значных. Гаспадар гэтага агарода і стаў ініцыятарам скаргі, а іншыя жыхары падпісаліся фактычна «за кампанію».

...Нядаўна мы зноў звярталіся да аналагічнай праблемы, якая турбавала жыхара вёскі Бобрык Пінскага раёна Уладзіміра Цімафеевіча Кахновіча. Нагадаем, наконт патраў дзікамі сваіх сотак заяўнік мусіў звяртацца ў рэдакцыю двойчы. Бо пасля першага тэлефанавання ў маі, паводле слоў вяскоўца, так нічога і не было зроблена: жывёла працягвала рабіць сваю «справу». Прэтэнзіі грамадзяніна мы давялі да ведама кіраўніцтва Пінскага райвыканкама. Што ў выніку было зроблена дзеля вырашэння праблемы, якая фактычна ўжо «дапякла» Уладзіміра Цімафеевіча? Паводле слоў спецыяліста аддзела па працы са зваротамі грамадзян райвыканкама Уладзіміра Цыбулькі, на месца выязджала камісія. Заяўніку выдадзены акт адносна патраў. Цяпер ён самастойна можа вырашаць пытанне адносна выплаты яму кампенсацыі за нанесеную патравамі шкоду, прад'явіўшы свае прэтэнзіі арандатару паляўнічых угоддзяў — або ў добраахвотным парадку з боку апошняга, або, калі першы варыянт не атрымаецца, у судовым парадку. Акрамя таго, было прынятае рашэнне правесці ў мясцінах паблізу вёскі Бобрык інтэнсіўны адстрэл дзікоў. Прычым самім паляўнічых грашовыя пытанні (плата за дазволы на паляванне і за мяса дзікоў), як сказаў Уладзімір Цыбулька, турбаваць не будуць.

Прыведзеныя сітуацыі, як бачна, падобныя толькі ў адным: самой наяўнасцю фактаў патраў людскіх сотак дзікамі. Шляхі ж прынцыповага вырашэння праблемы зусім розныя. Зрэшты, як розными ў названых выпадках з'яўляюцца і арандатары паляўнічых угоддзяў... Як паведамляецца на сайце паляўнічай гаспадаркі «Каралеўскае паляванне», узровень сэрвісу, які прадастаўляецца ў ёй, пастаянна расце, паляўніцтвазнаўцамі і егерамі праводзіцца вялікая праца па доглядзе і падкормцы жывёлы. Карацей кажучы, усе аматары палявання і актыўнага адпачынку змогуць адчуць тут усе прывабнасці «сапраўдных мужчынскіх забаў», як пішацца там жа. І нічога заганнага і ў самых словах, і ў справе ўвогуле няма. Акрамя хіба адной невялічкай праблемы, што ўскосна мае дачыненне да ўсяго гэтага, — перарытага агароду Ніны Андрэеўны...

Ёсць пытанне!

## Каб атрымаць пратэз вока бясплатна...

**У дыягнастычным цэнтры Віцебска сказалі, што мне, інваліду 2-й групы па зроку, неабходны бясплатны пратэз вока. Куды для гэтага трэба звяртацца?**

**Дзмітрый Аляксандравіч Мешчаракоў,** *Талачынскі раён.*

Існуюць спецыяльныя нарматыўныя дакументы, паводле якіх разглядаюцца падобныя пытанні. Для дакладнага адказу неабходна ведаць ваш анамнез. Таму, калі ласка, звярніцеся з вашым пытаннем да галаўнога ўрача раённай бальніцы або непасрэдна ва ўпраўленне аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама (тэлефон прыёмнай — 8 (0212) 36 29 79).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Рэпартаж з колаў

# «Адпусціце мяне, мужыкі!»

**«МУЖЫКІ, ну давайце я дамоў далей паеду!» — паўтараў моцна выпіўшы жыхар Віцебскага раёна, звяртаючыся да афіцэраў ДАІ і карэспандэнта «Звязды». Уявіце сабе: ехаў ён на старым матацыкле мала таго што вельмі нецвярозы, дык яшчэ без усякіх дакументаў. Потым высветлілася, што правоў у яго няма яшчэ... з савецкіх часоў.**

У рэйд мы адправімліся на цывільным аўто разам з капітанам Сяргеем Масейкіным і маёрам Сяргеем Філіпавым. У Дзяржаўтаінспекцыі спецыяльна выкарыстоўваюць аўтамабілі, якія не абазначаныя спецыяльнай міліцэйскай сімволікай, каб быць незаўважанымі. Пры ўсім тым, што самі інспектары ў форме ўважліва сочаць за тым, што адбываецца на дарогах.

Першым парушальнікам, які нам трапіўся, стаў малады кіроўца «БМВ». У салоне побач сядзела маладая жанчына. Шкло па баках аўто ў яго было таніраванае. Адразу кіроўца не хацеў спыняцца. Давялося прыбавіць хуткасць і абагнаць. Афіцэры растлумачылі, што ад таніроўкі трэба пазбавіцца. Кіроўца пачаў спрачацца. Толькі пасля слоў, што аштрафуюць на дзве базавыя велічыні (70 тысяч на дарозе не валяюцца), адарваў плёнкі. Далей і смех і грэх, як кажуць. Такое ўражанне пакінула на яго сустрэча з намі, што ён забыў сваё пасведчанне ў салоне міліцэйскай машыны. Давялося зноў адправіцца ў пагоню, каб вярнуць вадзіцелю яго правы. А ён ужо спыніўся ля дачнага дома.

А вось юныя веласіпедысты едуць па дарозе. Хлопчык і дзяўчынка ехалі не па той паласе, дзе патрабуецца. З імі правялі выхаваўчую размову.

Па рацыі паведамілі, што вадзіцелі заўважылі на дарозе нецвярозага матацыкліста. Гэта той самы, пра якога расказаў у пачатку рэпартажу. Пад'ехалі.

«Піў»? — цікавімся. У адказ: «Піва піў пасля лазні, у сваяка быў у суседняй вёсцы. З жонкай я пасварыўся. Настрой быў дрэнны»...

Пры аглядзе матацыкла ў калясцы заўважылі віно. Паўза. «І віно піў?» — зноў пытаем. У адказ: «Трохі». Самае нечаканае, што і нам прапанаваў выпіць.

Потым ужо, падчас таго, як у бальніцы правяралі яго «на алкаголь», ён прызнаўся ў тым, што піў гарэлку.

Каб даставіць матацыкл на штрафную стаянку Упраўлення ДАІ Віцебскага аблвыканкама, маёр сеў за руль. Мужык з намі ў салоне. Усё прасіў, каб адпусцілі. Матацыкл завесці было цяжка. Мужык выйшаў і спрабаваў дапамагчы. Зразумелі, што свечкі падводзяць, але матацыкл завёўся. Маёр праехаў на ім няшмат: ізноў зламаўся. Завялі. Потым яшчэ. Так і ехалі да Віцебска.

Матацыкл — на штрафную стаянку. Уладара — у бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Сюды прывозяць усіх, каб высветліць ступень нецвярозасці. Аказалася, што ў нашага матацыкліста ў крыві 2,36 праміле. Напэўна, для замежніка гэта была б смяротная доза. Наш чалавек і за руль сесці можа. За тое, што ехаў нецвярозы, без правоў кіроўцы, без пасведчання аб тэхнічным аглядзе, страхоўкі, заплаціў буйны штраф. А працуе, як прызнаўся, зваршчыкам у гаспадарцы.

Што асабіста мяне ўразіла ў кабінеце нарколага, дык гэта комплекснае даследаванне. Мала таго, што прыбор паказаў — нецвярозы. Дык яшчэ просяць адказваць на пытанне, дакрануцца рукой да носа і гэтак далей. Такая вось тэст-«гімнастыка». А яшчэ вельмі ўразіла тое, што з суседняга будынка — морга вынеслі труп жанчыны.

Мо яна загінула на дарозе? Не выключаецца. І вінаваты ў гэтым нецвярозы вадзіцель? Ну дык «адпусціце мяне, мужыкі?»

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Віцебскі раён.*


УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона)

Минский городской центр недвижимости

09 августа 2010 года ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом зданий, сооружений и иного имущества ОАО «Гомельхимторг»:

| | |
|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - здание склада тары и топлива общей площадью 453 кв.м (333/С-44442), инв. № 603;<br>- навес общей площадью 580,6 кв.м (333/С-19995), инв. № 712;<br>- здание склада общей площадью 488,5 кв.м (333/С-19997), инв. № 604;<br>- благоустройство (дороги) площадью 2 312 кв.м, инв. № 605;<br>- пожарный водоем объемом 162 куб.м, инв. № 607;<br>- забор (дощатый на металл. столбах) площадью 349 кв.м, инв. № 610;<br>- забор железобетонный площадью 90 кв.м, инв. № 610;<br>- забор железобетонный площадью 263 кв.м, инв. № 610;<br>- отстойник объемом 3 куб.м, инв. № 611;<br>- площадка пиломатериалов, площадь 288 кв.м, инв. № 615;<br>- внешние телефонные и телеграфные сети, протяженность 1,7 км, инв. № 614;<br>- внутриплощадочные сети водопровода, протяженность 65 м/п, инв. № 613;<br>- тепловые сети к проходной, протяженность 36 м/п, инв. № 612;<br>- внутриплощадочная бытовая канализация, протяженность 200 м/п, инв. № 606;<br>- наружные высоковольтные сети электропередач, протяженность 0,95 км, инв. № 608;<br>- низковольтный кабель наружного освещения, протяженность 0,978 км, инв. № 609. |
| **Сведения о земельном участке** | кадастровый номер 322350100002002551, площадь 0,8420 га |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Гомельская область, Калинковичский район, г. Калинковичи, ул. Ф. Энгельса, 21 |
| **Собственник продаваемого имущества (продавец)** | ОАО «Гомельхимторг», 246010, ул. Могилевская, 20, г. Гомель, телефон (0232) 54 87 48 |
| **Начальная цена с учетом НДС** | 152 389 142 белорусских рубля |
| **Сумма задатка** | 1 523 891 белорусский рубль |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи.

Аукцион состоится **09 августа 2010 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 07.07.2010 по 06.08.2010 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**

**(0232) 54 87 48, ОАО «Гомельхимторг».**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Октябрьский районный исполнительный комитет Гомельской области сообщает о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельных участков.

**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельных участков.

| Информация по лотам | Лот № 1 |
|---|---|
| **Кадастровые номера и адреса земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона, их количество и размеры, целевое назначение** | **Кадастровый номер** земельного участка – 324055100001007121; **адрес:** Гомельская обл., г.п. Октябрьский, ул. Гоголя, д. 2Б; **площадь:** 0,0100 га; **назначение:** земельный участок для строительства и обслуживания магазина. |
| **Сроки аренды земельных участков** | 50 лет |
| **Характеристика расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и инженерно-геологических условий** | Участок свободен от застроек |
| **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Места и условия подключения к инженерным сетям определяются техническими условиями с учетом нагрузок на стадии изготовления проектно-сметной документации. |
| **Начальная цена права заключения договора аренды** | 186290 (сто восемьдесят шесть тысяч двести девяносто) белорусских рублей |

**Аукцион состоится** в 10.00 10 августа 2010 года в зале заседаний райисполкома (1 этаж) по адресу: Гомельская обл., г.п. Октябрьский, ул. Советская, 57. Аукцион является открытым, проводится комиссией райисполкома по организации и проведению аукционов по предоставлению земельных участков в соответствии с порядком, предусмотренным Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Заявления и прилагаемые к ним документы принимаются** в кабинете № 316 Октябрьского райисполкома со дня опубликования данного извещения по рабочим дням с 9.00 до 17.00 до 05 августа 2010 года.

**Адрес и номер контактного телефона комиссии:** 247319, Гомельская обл., г.п. Октябрьский, ул. Советская, 57, тел.: 802357-21472.

**Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в указанный срок подает:** заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию представляются документы в соответствии с п. 12 Положения о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года № 462.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

**Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты платежного документа** для перечисления денежных средств и иные условия участия в аукционе:

**задаток** для участия в аукционе составляет 5 % от стоимости предмета аукциона; **внесение задатка осуществляется** до подачи документов для участия в аукционе, заверенная копия платежного поручения о внесении задатка прилагается к заявлению на участие в аукционе;

**реквизиты платежного документа для перечисления денежных средств:** р/с 3641425000038, УНП 400007411, ОКПО 04063428, ЦБУ № 319 в г.п. Октябрьский филиала № 322 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Светлогорска, МФО 853, назначение платежа 04002.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Подробная информация о **порядке осмотра земельных участков, расходах, подлежащих возмещению, условиях предусмотренных в решении райисполкома** об изъятии земельных участков для проведения аукциона на официальном сайте Октябрьского райисполкома www.oktiabrskiy.gomel-region.by.

**Условия проведения аукциона:** аукцион на право заключения договора аренды земельных участков проводится при наличии не менее двух участников в отношении предмета аукциона.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона) 09 августа 2010 года

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий, сооружений и иного имущества
ОАО «Торговый дом «Белресурсы»:

| Номер лота | № 1 | | |
|---|---|---|---|
| Наименование продаваемого имущества | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| | Административное здание, площадь 60 кв. м | 710/С-57358 | 11871 |
| | Производственно-заготовительный участок сбора вторичных ресурсов, площадь 365,6 кв. м | 710/С-57359 | 11876 |
| | Склад, площадь 287,9 кв. м | 710/С-57360 | 11877 |
| | Зеленые насаждения | | 12006 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 741000000010003390, площадь 0,4727 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Ковзана, Б.И., 5 | | |
| Начальная цена | 641 066 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 64 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | | | |

| Номер лота | № 2 | | |
|---|---|---|---|
| Наименование продаваемого имущества | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| | Мастерская, площадь 1337,0 кв.м | 410/С-19277 | 11607 |
| | Водопровод | | 11611 |
| | Электрокабель | | 11806 |
| | Мощение | | 11609 |
| | Ограждение. Ворота. Калитка | | 11610 |
| | Административное здание, площадь 125,9 кв.м | 410/С-20625 | 11608 |
| | Объекты озеленения | | 11800 |
| | Объекты озеленения | | 11801 |
| | Объекты озеленения | | 11802 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 420850100001006261, площадь 1,9309 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Волковысский район, г. Волковыск, ул. Жолудева, д. 76 | | |
| Начальная цена | 1 325 240 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 130 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | | | |

| Номер лота | № 3 | | |
|---|---|---|---|
| Наименование продаваемого имущества | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| | Сторожка, площадь 16,9 кв.м | 451/С-11478 | 11998 |
| | Склад тары, площадь 842,1 кв.м | 451/С-3331 | 11645 |
| | Мастерская | | 12011 |
| | Склад | | 12012 |
| | Навес | | 12013 |
| | Склад с мастерской, площадь 228,4 кв.м | 451/С-3332 | 11646 |
| | Пристройка | | 12014 |
| | Мастерская. Гараж | | 12015 |
| | Контора с котельной, площадь 138,6 кв.м | 451/С-3333 | 11651 |
| | Забор площадью 710 кв.м | | 11999 |
| | Металлические ворота | | 12000 |
| | Зеленые насаждения | | 11809 |
| | Зеленые насаждения | | 11810 |
| | Электрическая сеть | | 11808 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 422356300002000209, площадь 1,0927 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Железнодорожная, д. 7а | | |
| Начальная цена | 186 980 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 18 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | Договор аренды от 01.04.2010 (арендуемая площадь 42,9 кв.м) | | |

| Номер лота | № 4 | | |
|---|---|---|---|
| Наименование продаваемого имущества | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| | Трансформатор силовой ТМ-100/10 кВт | 412/С-12605 | 11723 |
| | Бункер | | 11641 |
| | Электрошкаф | | 11625 |
| | Одноэтажное кирпичное здание склада хранения тары, площадь 799,5 кв. м | | 11618 |
| | Котельная | | 11614 |
| | Дымовая труба | | 11991 |
| | Трансформаторная подстанция | 412/С-12606 | 11617 |
| | Воздушная линия | | 11990 |
| | Кабельная линия | | 11996 |
| | Кабельная линия | | 11997 |
| | Кабельная линия | | 11989 |
| | Одноэтажное кирпичное здание цеха, площадь 446,5 кв.м | 412/С-12607 | 11615 |
| | Уборная | | 11988 |
| | Сарай | | 12017 |
| | Сарай | | 11993 |
| | Сарай | | 11994 |
| | Сарай | | 11995 |
| | Пристройка | | 12016 |
| | Навес | | 11987 |
| | Котельная с дымовой трубой | | 11992 |
| | Водопровод | | 11623 |
| | Забор | | 11982 |
| | Забор | | 11983 |
| | Забор | | 11986 |
| | Забор | | 11622 |
| | Ворота | | 11984 |
| | Ворота | | 11985 |
| | Мощение | | 11621 |
| | Одноэтажное дощатое административное здание, площадь 102 кв.м | 412/С-12608 | 11620 |
| | Объекты озеленения | | 11803 |
| | Объекты озеленения | | 11804 |
| | Объекты озеленения | | 11805 |
| | Объекты озеленения | | 11807 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 424050100012000004, площадь 0,5700 га; кадастровый номер 424050100013000004, площадь 0,7100 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Занеманская, д. 54 | | |
| Начальная цена | 890 659 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 89 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | Договор аренды от 01.04.2009 (арендуемая площадь 12,3 кв. м); договор аренды от 20.02.2009 (арендуемая площадь 305,6 кв. м, 21,0 кв. м); договор аренды от 01.04.2006 (арендуемая площадь 189 кв. м) | | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **09 августа 2010 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 09.07.2010 по 06.08.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**
**(017) 278 35 35, ОАО «ТД «Белресурсы» (ул. Казинца, 2, 220099, г. Минск).**


# ЛЕПШ ПАДРЫХТУЕШСЯ — ДАЎЖЭЙ ПАЖЫВЕШ

Прамая лінія

**На вашы пытанні адказала дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў ВАРОНІНА**

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

**(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 6, 7 і 8 ліпеня.)**

☎ ***— Жодзіна, Ядвіга. Ці можа гастрыт прайсці сам па сабе, калі захоўваць дыету?***

— Безумоўна, можа, калі захоўваць дыету, весці здаровы лад жыцця, асабліва не курыць і, па магчымасці, пазбягаць псіхічных нагрузак.

☎ ***— Светлагорск, Наталля Іванаўна. Ці можна ў сталым узросце выдаляць радзімкі? Урач параіла абавязкова зрабіць гэта, а я сумняваюся.***

— Калі ўрач параіла выдаляць радзімку, то, верагодна, мела падставы для гэтага. Хутчэй за ўсё, у вас не проста радзімка, а невус, які можа расці і прывесці да рызыкі ўзнікнення меланомы.

☎ ***— Гродна, Ірына. Маёй маці 83 гады. Скажыце, якія вітаміны ёй лепш за ўсё прымаць?***

— Яна можа прымаць любыя полівітаміны ў таблетаваным або вадкім выглядзе. У іх склад павінна ўваходзіць дастатковая колькасць кальцыю, медзі і магнію. Гэта тыя элементы, якіх звычайна не хапае ў састарэлым узросце. Супрацьпаказанняў для прыёму вітамінаў у вашай маці няма.

☎ ***— Рагачоў, Валерыя Пятроўна. У 65 гадоў я зламала шыйку бядра. Лячэнне было працяглым, перанесла аперацыю. Цяпер хаджу з кавенькай. І ўвесь час баюся, што траўма можа паўтарыцца. Ці можна засцерагчыся ад гэтага?***

— Рэкамендую вам зрабіць дэнсітаметрыю касцявой тканкі, паглядзець, якія змяненні ёсць у касцях. Калі ў вас выражаны астэапароз, то засцерагчыся ад пераломаў будзе вельмі складана. А калі ў вас у 65 гадоў была траўма, напрыклад, з-за таго, што вы ўпалі з вышыні, то гэта зусім не азначае, што ў вас дрэнная касцявая сістэма. Але ў любым выпадку дэнсітаметрыя рэкамендуецца ўсім, гэтак жа як і кантроль артэрыяльнага ціску. Такое абследаванне дапамагае вызначыць, ці ёсць у чалавека рызыка пагрозы пераломаў. Прафілактыка хваробы будзе залежаць ад вынікаў абследавання.

☎ ***— Глуск, Людміла. Мне 50 гадоў. Ціск 190/100. Прымаю два разы на дзень эналапрыл — 10 мг. Ці правільна я раблю? Можа, трэба прымаць часцей?***

— Калі ў вашым узросце трымаецца ціск 190/100 пры прыёме эналапрылу, значыць, дазіроўка прэпарату маленькая. Трэба або павялічыць дозу, або дадаць яшчэ нейкія прэпараты. Эналапрыл можна прымаць не два, а тры разы на дзень. Пры адэкватна падабраным лячэнні ціск павінен нармалізавацца. Падбор прэпаратаў можа зрабіць участковы тэрапеўт.

☎ ***— Лепель, Соф'я. Якой дыеты вы параілі б прытрымлівацца пры атэрасклерозе?***

— Па ўсіх міжнародных дыягнастычных рэкамендацыях пры атэрасклерозе трэба зменшыць ужыванне мяса. Яго можна есці па 150—180 г і не часцей, чым двойчы на тыдзень. Пажадана, каб гэта было не тлустае мяса, а ялавічына, маладая бараніна, індычка, трусяціна. А ўвогуле мяса лепш замяніць марской рыбай. Смажаную бульбу можна ўжываць 1 раз у два тыдні. Яйкі — не больш за 2 на тыдзень. Дакладней, бялок можаце есці колькі заўгодна, а жаўток трэба абмяжоўваць. Соль — не больш за 5—8 г у дзень. Абавязкова трэба, каб у харчаванні прысутнічалі малочныя прадукты, асабліва кісламалочныя. На ноч рэкамендуецца шклянка кефіру з лыжкай алею, што дапамагае нармалізаваць мікрафлору. У цэлым дыета павінна быць гіпакаларыйнай, з нізкім утрыманнем тлушчу.

☎ ***— Смалявіцкі раён, Іван. 73 гады. У апошні час у мяне баліць пад правым рабром. З чым гэта можа быць звязана?***

— Вам трэба абследавацца і перш за ўсё паглядзець, ці няма ў вас камянёў у жоўцевым пузыры. Часам такі боль можа быць пры змяненнях у пазваночніку. Трэба таксама праверыць печань. Няхай вам прызначаць ультрагукавое абследаванне брушной поласці. І яшчэ. Такія непрыемныя адчуванні бываюць у людзей, у якіх ёсць схільнасць да запораў. Пасачыце за тым, каб у вас быў рэгулярны стул.

☎ ***— Гомель, Алена. Маёй бабулі 84 гады. У яе вельмі моцна баляць ногі, літаральна выкручвае кожную костку, яна не спіць па начах. Здавалі аналізы, абследаваліся ў тэрапеўта. Урач гаворыць, што нічога асаблівага не бачыць і, хутчэй за ўсё, гэта звязана з узростам. Як нам быць?***

— Я, безумоўна, не ведаю, якое абследаванне прызначыў доктар, і ці было яно дастатковым. Аднак у людзей ва ўзросце не павінны балець ногі, а тым больш так востра. Але ёсць некаторыя захворванні накшталт рэўматычнай поліміягіі, калі можа выкручваць рукі і ногі, тут трэба прызначаць адпаведнае лячэнне. Бабулі трэба звярнуцца да рэўматолага. І калі доктар вызначыць дыягназ, пра які я сказала, то трэба прызначыць маленькія дозы гармонаў, і боль дастаткова хутка пройдзе. Наколькі я ведаю, у Гомелі ёсць шпіталь для ветэранаў і інвалідаў. Кіраўніцтва вашай паліклінікі магло б дамовіцца з галоўным урачом шпіталя, каб вашу бабулю абследавалі там больш дэталёва.

☎ ***— Бярэзінскі раён, Ніна Іосіфаўна, 75 гадоў. Апошнім часам дрэнна сябе адчуваю: слабасць, арытмія, дрэнна сплю. Урач выпісала шмат лекаў, але нічога не дапамагае...***

— У вас проста дрэнна падабранае лячэнне, прычым у наяўнасці — сур'ёзная сардэчная недастатковасць. Адсюль і слабасць. Вас трэба абавязкова шпіталізаваць, каб добра абследавацца ў кардыёлага і атрымаць адпаведнае лячэнне. Арытмія, якая ў вас ёсць, карэгіруецца. Трэба пралячыцца, і вам стане лягчэй.

☎ ***— Салігорск. Валянціна Пятроўна. Дзе на мясцовым узроўні можна прайсці платнае абследаванне ў неўрапатолага?***

— За адзін дзень платна можна прайсці ўсе абследаванні ў Мінскай абласной бальніцы, якая знаходзіцца ў Бараўлянах. Цяпер, як правіла, чаргі да спецыялістаў няма. Цэны тут даступныя, узровень абследаванняў добры. Калі ж вы возьмеце сюды накіраванне па месцы жыхарства, то абследаванне будзе бясплатным.

☎ ***— Смаргонскі раён, Ірына. 63 гады. У мяне слабасць, патлівасць. Урачы прычыну гэтага не знаходзяць. Што рабіць?***

— Часам такія рэчы бываюць пры эндакрынных захворваннях. Вам абавязкова трэба здаць кроў на гармоны шчытападобнай залозы. А яшчэ трэба паглядзець, ці не выходзіце вы на нейкі рэўматалагічны працэс. Для гэтага неабходна звярнуцца па кансультацыю да рэўматолага. Часам такі стан бывае, але вельмі рэдка, пры туберкулёзе. Вас трэба абследаваць.

***— Накіраванне браць?***

— Так, накіраванне ў Гродзенскую абласную бальніцу вам павінен даць ваш участковы ўрач або загадчык паліклінікі.

***— Яшчэ скажыце, калі ласка, як можна праверыць лёгкія, акрамя флюараграфіі?***

— Флюараграфія — не вельмі добры метад. Можна зрабіць звычайны рэнтгенаўскі здымак ці рэнтгенаскапію на добрым апараце, дзе ёсць шмат ракурсаў. Рэнтгенаскапія на апаратах апошняга пакалення вельмі дакладная. Яшчэ можна зрабіць камп'ютарную тамаграфію лёгкіх.

# ЦІ ПАСАДЗЯЦЬ ПІЦЕРСКАГА БІЗНЭСОЎЦУ, ЯКІ СПРАБАВАЎ ЗГВАЛЦІЦЬ НАШУ СТУДЭНТКУ?

Гучная справа: працяг тэмы

**Толькі з трэцяй спробы гендырэктара буйнога ахоўнага прадпрыемства Лерніка Таканджана змаглі змясціць у СІЗА. У красавіку мінулага года ён спрабаваў згвалціць беларуску Юлю Папову, якая, ратуючыся, скокнула з акна. Дзяўчына атрымала цяжкія траўмы і некалькі месяцаў была прыкаваная да бальнічнага ложка. Таканджан, ратуючы рэпутацыю, сам напісаў заяву на беларуску: «Яна хацела скрасці ў мяне сямейныя каштоўнасці». Пра развязку гучнай крымінальнай справы чытайце ў матэрыяле Яўгена ВАЛОШЫНА.**



**Дзяўчына атрымала сур'ёзныя траўмы. Гэта калі выказвацца мякка. У спіну і галёнку давялося ставіць імплантанты, некаторыя косткі даводзілася ўзнаўляць літаральна па друзачках, пра шматлікія гематомы ад удараў Таканджана можна і не ўзгадваць.**

Пра цяжкі ўдар, які атрымала бабруйчанка Юля Папова, «Звязда» пісала яшчэ мінулым летам (нумар за 25 ліпеня 2009 года). Прывабная беларуская дзяўчына, студэнтка юрыдычнага факультэта Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, уладкавалася працаваць на ахоўнае прадпрыемства. Генеральны дырэктар, Лернік Таканджан, пасля адной з карпаратыўных вечарын узяўся падвезці падначаленую да студэнцкага інтэрната. Жыў начальнік непадалёк.

Вось што распавяла Юля Папова пра той страшны вечар яшчэ год таму. Яе словы некаторыя ўспрынялі крытычна, але факты былі пацверджаныя папярэднім следствам.

*— Спыніўся ён каля свайго дома — «Выходзь». Я выйшла з машыны,* — спрабавала гаварыць Юля спакойным тонам.*— Я сказала: «Да пабачэння» і рушыла ў бок інтэрната, але начальнік схапіў мяне за руку і гвалтам зацягнуў у свой пад'езд. У выніку я трапіла ў яго кватэру* (знаходзіцца на другім паверсе па вуліцы Апачыніна. — «Звязда»). *Думала, гэтым усё абмяжуецца. На працы ён расказваў, што з'яўляецца мецэнатам многіх цэркваў у горадзе, ведае многіх у вертыкалі ўлады, у праваахоўных органах. У кватэры ён пераўтварыўся ў жывёлу, спрабаваў згвалціць, але я не давалася. Тады ён пачаў зрываць з мяне вопратку, біць кулаком па твары... Дастаў нейкую шаблю з-пад ложка і сказаў, што зарэжа мяне і выкіне з акна, калі я яму не аддамся. Шаблю ён дэманстраваў некалькі разоў. І я прыняла рашэнне скокнуць з акна... Скокнула, пачала прасіць аб дапамозе. Па вуліцы ішлі дзяўчаткі, яны выклікалі «хуткую»... Каля тыдня я была ў цяжкім стане, ляжала ў Пакроўскай бальніцы. Потым да мяне прыйшлі нейкія людзі, назваліся аператыўнікамі. Яны казалі, што на мяне ўжо падрыхтаваны праект справы па артыкуле 161 расійскага крымінальнага кодэкса (рабаванне). Казалі, што начальнік напісаў на мяне заяву, маўляў, я скрала ў яго нейкі залаты медальён, а потым скокнула з акна. Як я пасля даведалася, тая крымінальная справа была потым закрытая. А калі ў Пецярбург прыехаў мой бацька, ён завёз ужо маю заяву ў гарадскую пракуратуру...*

Да ўсяго гэтага дададзім, што дзяўчына атрымала сур'ёзныя траўмы. Гэта калі выказвацца мякка. У спіну і галёнку давялося ставіць імплантанты, некаторыя косткі даводзілася ўзнаўляць літаральна па друзачках, пра шматлікія гематомы ад удараў Таканджана можна і не ўзгадваць.

Дарэчы, змясціць у СІЗА генеральнага дырэктара змаглі толькі з трэцяй спробы. Гісторыі пра мецэнацтва і «сувязі» аказаліся праўдзівымі. Трэба сказаць, што следчы па асабліва важных справах следчага ўпраўлення Следчага камітэта пры пракуратуры Расійскай Федэрацыі Пётр Пятроў, які раскручваў справу, сваю пасаду ўжо не займае. Як і журналіст піцерскай «Камсамолкі» Аляксандр Ермакоў, які рыхтаваў самыя першыя матэрыялы пра гісторыю Юлі Паповай. Але ці звязаны кадравыя змены ў жыцці следчага і журналіста з крымінальнай справай Лерніка Таканджана — невядома.

Разбіральніцтвы і судовыя пасяджэнні па справе шэфа-гвалтаўніка цягнуліся больш за год. Быццам судзілі не звычайнага смяротнага, а серыйнага маньяка Чыкацілу. Таканджана абвінавацілі па артыкуле «Замах на згвалтаванне, які пацягнуў па неасцярожнасці цяжкую шкоду здароўю». Апошняе судовае пасяджэнне прайшло пятага ліпеня.

*— А прысуд суддзя Панамарова будзе абвяшчаць дзявятага жніўня,* — паведамляе **прэс-сакратар гарадскога суда Санкт- Пецярбурга Крысціна ВАЖЭНІНА**. — *Але верагодна, што гэта будзе не апошняя кропка.*

Юрысты прагназуюць, што калі б па справе праходзіў звычайны чалавек, то атрымаў бы як мінімум чатыры гады пазбаўлення волі. А Таканджан, на думку некаторых праваабаронцаў, можа атрымаць усяго толькі ўмоўны тэрмін. Але дачакаемся судовага рашэння.

Фізічная і псіхалагічная рэабілітацыя Юлі Паповай цягнулася больш за год. Прынамсі сёння дзяўчына можа нармальна хадзіць. Увесь гэты час Юля жыла дома, у Бабруйску.

*— Яна брала акадэмічны адпачынак, але зараз узнаўляецца на вучобу,* — распавяла карэспандэнту «Звязды» Рэгіна Шарукова, былая аднакурсніца Юлі Паповай. — *Справы ў яе ідуць някепска.*

«Звязда» будзе сачыць за вынікамі гучнай крымінальнай справы шэфа-гвалтаўніка.

Дарэчы

## АХОЎНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА ТАКАНДЖАНА НЕ ДАПАМАГЛО ПАПУЛЯРНАМУ ШОУМЕНУ

Ахоўнае прадпрыемства, якое ўзначальваў крыўдзіцель Юлі Паповай, называлася «Балтыйская перспектыва і спецсувязь». Кантора аказвала паслугі па ахове аб'ектаў нерухомасці не толькі ў Санкт-Пецярбургу, але і ў Маскве, іншых буйных гарадах Расіі.

Цікава, што сузаснавальнікам «Балтыйскай перспектывы і спецсувязі» быў шоумен Аляксандр Цэкала (той самы Саша, што спяваў разам з Лалітай у кабарэ-дуэце «Акадэмія» і вядзе папулярную праграму «Пражэктарпэрысхілтан» па Першым канале расійскага тэлебачання). У 2008 годзе Цэкала збудаваў катэдж у Падмаскоўі, дзе пасяліўся з маладой жонкай. Натуральна, што ахову дома забяспечвала свая ж кантора — «Балтыйскае перспектыва і спецсувязь». Але ў снежні 2008 года ў катэдж уварваліся рабаўнікі, далі шоумену кухталёў і скралі каштоўнасцяў на 500 тысяч долараў ЗША.

# КУДЫ ПРЫВЯДЗЕ «ЧАС ЗАЦЬМЕННЯЎ»?

777

**Паводле сцвярджэнняў астролагаў, мы цяпер знаходзімся ў так званым «часе зацьменняў», які значна ўплывае на лёс кожнага асобнага чалавека і грамадства ў цэлым. У чым сутнасць гэтай з'явы і якім чынам яна можа стаць небяспечнай для нас журналісту «Звязды» расказаў астролаг Уладзімір ВАСЮК.**

— «Час зацьменняў» — гэта адрэзак часу паміж двума зацьменнямі рознага парадку. Як правіла, «час зацьменняў» назіраецца двойчы на год, — патлумачыў астролаг. — «Час зацьменняў» можна параўнаць з выніковай кантрольнай за чвэрць для вучня. У гэты час «замацоўваецца» нейкі матэрыял. Нябесная канцылярыя аналізуе вынікі папярэдняй духоўнай работы чалавека, ацэньвае іх і ставіць «адзнаку». Прычым адзнака за вынікі работы ставіцца не заўсёды адразу, а ў большасці выпадкаў крыху апасля, праз пэўны прамежак часу, калі «кантрольная» будзе «праверана». Трэба ўлічваць, што ўплыў зацьмення адчуваецца не толькі непасрэдна ў дзень самога зацьмення, але і на працягу паўгода (тое, што «акрэсліваецца» падчас зацьменняў, часта рэалізуецца на працягу найбліжэйшых 6 месяцаў).

**Вельмі важна ў «час зацьменняў» уважліва сачыць за сваім здароўем. Праблемы ў гэтай галіне падчас месяцавага зацьмення з'яўляюцца «напамінам» аб вашых памылках у мінулым, а праблемы са здароўем падчас сонечнага зацьмення «сігналізуюць» аб сур'ёзнай небяспецы ў будучыні.**

Зацьменні (і месяцавыя, і сонечныя) па-рознаму ўплываюць на людзей — усё залежыць ад індывідуальнага гараскопа. Калі гараскоп чалавека «рэзаніруе» з зацьменнем (яно закранае нейкія важныя кропкі натальнай карты), тады зацьменне для гэтага чалавека будзе значнай падзеяй. Калі зацьменне «закранае» пазітыўныя паказчыкі гараскопа, то адпаведна і ўплыў на чалавека зацьменне будзе мець пазітыўны. І наадварот: калі яно закранае негатыўныя кропкі, то і ўплыў яго будзе негатыўным.

Астролаг падкрэсліў, што само па сабе зацьменне — не добрае і не дрэннае. І зноў жа правёў паралель са школай.

— Калі школьнік добра вучыцца, для яго кантрольная — не бяда, ён ведае, што атрымае выдатную адзнаку. А для двоечніка кантрольная — кашмар, бо ён разумее, што акрамя дрэннай адзнакі ён яшчэ і наганяй ад бацькоў атрымае.

Як даведацца, ці правільна мы жывём (у адпаведнасці з касмічнымі законамі, ці не?) і якую «адзнаку» можам атрымаць ад нябеснай канцылярыі за «кантрольную»?

— У перыяд, пра які мы гаворым («час зацьменняў»), як правіла, адбываюцца падзеі, якія чалавек не ў стане кантраляваць. Прычым тут верагодныя дзве крайнасці развіцця падзей: усё вельмі дынамічна, ці наадварот — усё вельмі спакойна. Калі ўсё вельмі спакойна, як штыль на моры, тады можна сцвярджаць, што чалавек жыве правільна, у гармоніі з космасам. Калі ў яго жыцці ўсё дынамічна і гарманічна, значыць, ён рухаецца ў правільным кірунку, аднак рабіць яму гэта трэба больш інтэнсіўна. Калі ж падзеі развіваюцца дынамічна і негатыўна, гэта сведчанне таго, што чалавек нарабіў памылак. Яму варта задумацца, пераасэнсаваць вопыт і, магчыма, здаць «кантрольную» яшчэ раз. Падчас уздзеяння зацьменняў жыццё расстаўляе ўсё па сваіх месцах, усё адбываецца менавіта так, як і павінна, альбо «намякае» на тое, як павінна быць.

Астролаг параіў падчас зацьменняў больш назіраць за сабой, быць уважлівымі, не ініцыяваць канфлікту, па магчымасці пазбягаць негатыву ва ўсім (у думках, словах, дзеяннях). І абавязкова памятаць пра наступствы ўсіх падзей і ўчынкаў, якія адбываюцца ў гэты час.

...Месяцавыя зацьменні паказваюць мінулае чалавека, дапамагаюць падвесці вынікі — і на індывідуальным узроўні, і на калектыўным — для пабудовы больш гарманічнай будучыні.

— Падчас месяцавага зацьмення адбываюцца падзеі (як негатыўныя, так і пазітыўныя), якія вяртаюць нас да мінулага, у сітуацыі, дзе мы нарабілі памылак. Мінулае, да якога адбываецца вяртанне падчас месяцавага зацьмення, патрабуе пераасэнсавання, духоўнай перапрацоўкі, для таго, каб чалавек трывала стаў на ногі, здолеў з аптымізмам глядзець у будучыню. Тут назіраецца парадокс: з аднаго боку, зацьменне правакуе фатальныя падзеі, сведчыць аб адсутнасці выбару, з іншага — дае выбар. Фаталізм зацьмення заключаецца ў тым, што яно настойліва рэкамендуе звярнуць увагу на тую сферу, дзе ў чалавека намеціўся крызіс. Свабоду даруе ў тым выпадку, калі чалавек звярнуў на гэта ўвагу, прапрацаваў свае складаныя аспекты, зрабіў правільныя высновы і скарэктаваў жыццё. Тады перад ім адкрыюцца новыя гарызонты і новыя варыянты выбару — у асабістым жыцці, у кар'еры і інш. — у залежнасці ад яго індывідуальнага гараскопа.

Месяцавае зацьменне, якое адбылося 26 чэрвеня, было вельмі напружаным, і яго наступствы (як для асобнага чалавека, так і для грамадства ў цэлым) будуць адчувацца на працягу паўгода. Згаданае зацьменне праецыравалася на Паўднёва-Усходнюю Азію, Акіянію, Аўстралію, а таксама на паўночна-заходняе ўзбярэжжа Амерыкі. Значыць, асноўных падзей на ўзроўні грамадства варта чакаць менавіта там (верагодныя сур'ёзныя прыродныя катаклізмы).

Калі месяцавае зацьменне дае магчымасць змяніць мінулае (а дакладней сваё стаўленне да яго), то сонечнае «зарыентавана» на будучыню. Поўнае сонечнае зацьменне адбудзецца 11 ліпеня і будзе закранаць экватарыяльна-трапічныя шыроты паўднёвага паўшар'я. Планы, праекты, ініцыятывы, якія вы распачалі напярэдадні ці ў сам дзень сонечнага зацьмення, неабходна завяршыць і давесці да канца, інакш вынікі намаганняў будуць негатыўнымі. Нічога глабальнага (асабліва калі вы не ўпэўнены, што здолееце скончыць справу), лепш не пачынаць. Падчас сонечнага зацьмення трэба сувымераць свае жаданні са сваімі магчымасцямі.

І яшчэ вельмі важна ў «час зацьменняў» уважліва сачыць за сваім здароўем. Праблемы ў гэтай галіне падчас месяцавага зацьмення з'яўляюцца «напамінам» аб вашых памылках у мінулым, а праблемы са здароўем падчас сонечнага зацьмення «сігналізуюць» аб сур'ёзнай небяспецы ў будучыні. У «час зацьменняў» добра праводзіць прафілактычныя і аздараўленчыя працэдуры (займацца ёгай, загартоўваннем арганізма, больш гуляць, дыхаць чыстым паветрам). Па магчымасці на гэты час варта з'ехаць на дачу, да бабулі ў вёску, пабыць на прыродзе, вельмі станоўча на здароўі адаб'юцца прагулкі ля лясного вадаёма. Для захавання добрага самаадчування лепш абмежаваць на «час зацьменняў» ужыванне «цяжкай» ежы (яек, мяса), а павялічыць у меню аб'ём садавіны-гародніны. Напярэдадні і ў сам дзень поўнага сонечнага зацьмення 11 ліпеня астролаг раіць спажываць больш вады (пажадана крынічнай, калодзежнай ці хоць бы мінеральнай) — шклянку нашча ранкам і шклянку вечарам.

Сталічным кіроўцам у найбліжэйшыя некалькі дзён варта праяўляць павышаную асцярожнасць і быць удвая пільнымі за рулём на плошчы Бангалор, на вуліцах Някрасава, Пляханава, у раёне стадыёна «Дынама», універмага «Беларусь», медуніверсітэта і кінатэатра «Бярэсце».

**Інга МІНДАЛЁВА.**


## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | |
|---|---|---|
| Наименование объекта | **1. Смеситель-кормораздатчик Trioliet (инв. № 3294); 2. Смеситель-кормораздатчик Trioliet (инв. № 3295)** | |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, 111 В | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестский райагросервис» | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | **52 299 889** | |
| Размер задатка, руб. | **5 229 989** | |
| Тип и характеристика объекта | Смесители-кормораздатчики, применяются животноводами для механизации процессов приготовления и раздачи кормовых рационов. | |
| | Тип | 1200VLS |
| | Раздача корма | поперечный транспортер спереди |
| | Объем, $м^3$ | 12 |
| | Длина, м | 6,01 |
| | Ширина, м | 2,29 |
| | Высота, м | 2,45 |
| | Максимальная загрузка, кг | 5000 |
| | Необходимая мощность трактора, кВт/л.с. | 55/75 |
| Условия продажи | Без условий | |
| Условия оплаты | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл, код 153001331 УНП 102353509 | |

**Аукцион состоится 20 июля 2010 г. в 12.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329**
**РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:** *г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329* в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 19 июля 2010 г. до 17.00.**

**Контактный тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81.**

Документы, необходимые для участия в аукционных торгах, перечислены в объявлении, опубликованном в газете «Звязда» № 55 от 26.03.2010 г.



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В г. ОРШЕ

| № п/п | Месторасположение и площадь земельного участка | Начальная цена продажи (руб.) | Условия заключения договора аренды | Инженерное обеспечение участка | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок по ул. Шкловской в районе электроподстанции «Южная» в г. Орше площадью 0,2978 га. Кадастровый номер 242400000001003848 | 36 014 112 | Срок договора – 20 лет. Целевое использование – под автостоянку. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | В квартале застройки по ул. Шкловской в районе электроподстанции «Южная», где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, электрической и телефонной связи, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – отсутствует, участок находится в санитарно-защитной зоне, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется. | 3 601 410 |

*Примечание:*

1. Аукцион состоится в **11.00. 18 августа 2010 г.** в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагаются заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены объекта, а также:

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина или индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенная доверенность;

*представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

*представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

*представителем иностранного гражданина* – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

3. Победитель аукциона обязан:
- подписать протокол аукциона в день его проведения;
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка победителю аукциона;
- заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него.

4. Задаток вносится на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в АСБ «Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911.

5. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2, кабинет 18 сектор по управлению госимуществом и приватизации управления экономики Оршанского горисполкома **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 13 августа 2010 года включительно.**

**Контактные телефоны в г. Орше: (8 0216) 21 13 14, 21 12 42. Предварительное ознакомление с объектом торгов – контактный телефон в г. Орше: 24 40 32.**

# ЧЫРВОНА-АРАНЖАВЫ ФІНАЛ

**Толькі дзве гульні застаецца правесці на чэмпіянаце свету па футболе ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Праўда, якія — матч за 3-е месца і фінал!**

Няма сумненняў, што выхад у вырашальную стадыю мундыялю іспанцаў, якія напярэдадні змаглі «ўзламаць» «нямецкую машыну», перайграўшы Германію з лікам 1:0, і галандцаў ужо можна лічыць суперпоспехам. Як-ніяк, а футбалісты з Пірынеяў дагэтуль у фіналах сусветных першынстваў ніводнага разу не гулялі. А вось іх супернікі двойчы спрабавалі шчасця заваяваць «золата» — у 1974 і 1978 гадах. Праўда, абодва разы няўдала. Што скажуць «аранжавыя» ў найбліжэйшую нядзелю на гэты раз? Магчыма, падказку хутка дасць нямецкі васьміног Паўль, які пакуль ніводнага разу не памыляўся ў сваіх «прагнозах».

Зрэшты, балельшчыкі і футбольныя спецыялісты ўсяго свету ўжо ахрысцілі фінальнае дэрбі ў Іаганэсбургу чырвона-аранжавым — па колерах футболак зборных. У матчы за 3-е месца, які пройдзе заўтра, згуляюць зборныя Уругвая і Германіі.

Сёння сваё меркаванне наконт футбольнага чэмпіянату свету выказвае чарговы звяздоўскі эксперт.

**Вадзім ЖУК, суддзя міжнароднай катэгорыі: «Я ставіў на Аргенціну, Германію і Іспанію»**

***— Вадзім Дзмітрыевіч, вам часта даводзіцца даваць футбольныя каментарыі і як суддзі, і як балельшчыку. «Афрыканскі» чэмпіянат свету вас чымсьці здзівіў?***

— Думаю, што са мной пагодзяцца многія: футбольны мундыяль набыў павышаную цікавасць на стадыі, калі пачаліся гульні на выбыванне.

Пра справы судзейскія ўжо шмат сказана. Суддзі — жывыя людзі і таксама могуць памыляцца. А для таго, каб розных спрэчных момантаў было як мага менш, кіраўніцтву ФІФА трэба думаць аб удасканаленні судзейства.

***— На ваш погляд, фінальная пара ў асобе галандцаў і іспанцаў адпавядае «патрабаванням» сённяшняга дня?***

— Безумоўна. На гэтыя дзве зборныя рабілі стаўкі многія спецыялісты, там нічога дзіўнага не адбылося. Кожная з гэтых зборных заслугоўвае чэмпіёнскага звання. Хоць для іспанцаў гэта будзе першая спроба, а для іх супернікаў — трэцяя.

***— Робіце намёк, што «аранжавыя» больш заслугоўваюць залатых медалёў?***

— Ні ў якім разе. У гэтым выпадку старыя заслугі — не ў разлік. Усё будзе залежаць ад псіхалагічнай настроенасці зборных і ў нейкай ступені ад фартуны.

***— Асабіста вы на каго рабілі стаўкі напярэдадні сусветнага першынства?***

— І на іспанцаў таксама. Хоць прыярытэт аддаваў зборным Аргенціны і Германіі. Як бачыце, быў блізкі да ісціны. Але ж здарылася па-іншаму. Немцаў я ўвогуле не пазнаў у паўфінальнай гульні — куды толькі падзелася іхняе натхненне, агрэсія? А пра Аргенціну скажу так: камандзе Марадоны малавата было толькі добрай лініі нападзення. Для балансу патрэбна была і адпаведнай якасці абарона. А так выйшла тое, што мы бачылі.

***— Вадзім Дзмітрыевіч, калі вярнуцца да судзейскай тэмы, то хто, на ваш погляд, будзе абслугоўваць дзве вырашальныя гульні?***

— Думаю, што на заўтрашні паядынак за 3-е месца на месца галоўнага арбітра будуць назначаны бельгіец Франк дэ Блэкерэ альбо аргенцінец Эктор Бельдас. А вось на фінале, наколькі мне падказвае ўнутранае пачуццё і вялікая судзейская практыка, галоўным суддзёй будзе англічанін Ховард Уэб.

***— А што вы скажаце пра кандыдатуру ўзбекскага рэферы Раўшана Ірматава? У яго адрас, наколькі вядома, нейкіх нараканняў аб «некампетэнтнасці» не паступала.***

— Думаю, што суддзю з Узбекістана на фінал не паставяць не толькі са спартыўнага пункту гледжання. Уявіце, што ў такім надзвычай важным матчы Ірматаў дапусціць памылку. Колькі адразу з'явіцца меркаванняў, што ўсе беды толькі з-за таго, што рэферы, мякка кажучы, з небагатай сярэднеазіяцкай краіны. Калі нейкі момант недагледзіць англічанін, то паверце, у адрас Вялікабрытаніі шмат бруду выліта не будзе. Вось такая праўда.

***— За каго збіраецеся хварэць у фінале?***

— Паўтаруся, што мне на сёння імпануюць абедзве зборныя. Таму буду перажываць за прыгожы і бескампрамісны футбол.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**



Германія—Іспанія 0:1. Такія розныя пачуцці.




# ВАСЬМІНОГАВА ПРАЎДА

**Ведаеце, хто стаў самым папулярным героем паўфінальнай гульні зборных Іспаніі і Германіі? Не, гэта зусім не Карлас Пуёль, забіўшы пераможны гол. І нават не Давід Вілья — лепшы бамбардзір турніру. Гэта і не Фернарда Торэс, якога называюць адным з найпрыгажэйшых гульцоў свету. Пра немцаў таксама можаце не ўспамінаць.. Герой дня, пабіўшы ўсялякія тэлевізійныя рэйтынгі і пабываўшы на старонках амаль кожнага выдання, — васьміног Паўль!**

Маленькая жывёлка з класа галаваногіх жыве ў акіянарыуме нямецкага горада Аберхаўзэн. З першага матча зборнай Германіі ў ПАР Паўль прадказваў вынікі сваёй зборнай. Спосаб даволі просты: у акварыум да васьмінога змяшчалі дзве скрыні з ежай. На баках скрыні былі намаляваныя два сцягі — нямецкі і каманды-суперніцы. Выбар ежы той ці іншай краіны і вызначаў, хто пераможа ў найбліжэйшым супрацьстаянні. Здаецца, усё проста, але за гэтай прастатой хаваюцца дакладна вызначаныя перамогі Германіі над Аўстраліяй, Ганай, Англіяй і Аргенцінай. Нават сенсацыйнае паражэнне нямецкай каманды ад сербаў Паўль вызначыў. Як адзначаюць працаўнікі акіянарыума, два гады таму, на Еўра-2008, васьміног угадаў 80 % вынікаў — букмекерам і не снілася такая паспяховасць.

А цяпер абяцаюць з'есці. Засмажыць і з'есці. Прычым свае ж — немцы. Людзі наогул жорсткія стварэнні. І ўсе за тое, што бедная жывёла выбрала ежу са скрыні з іспанскім сцяжком, тым самым дакладна прадказаўшы выхад пірынейцаў у фінал. Аднак зразумець заўзятараў зборнай Германіі таксама магчыма.Трэці мундыяль запар іх любімцы выходзяць у чацвёрку наймацнейшых, але тытулу чэмпіёнаў свету немцы не бачылі ўжо 20 гадоў.

Сама гульня атрымалася не такой яскравай, як чакалася. З першых хвілін не пакідала ўражанне — ці немцы настолькі хітрыя і ўсё пралічылі, ці ў іх проста нічога не атрымоўваецца. Падначаленыя Яхіма Лёва аддалі ініцыятыву «чырвоным» і хвілін 10 наогул не пераходзілі цэнтр поля. Праўда, не сказаць, каб іспанцы паказвалі нешта звышардынарнае. Яны кантралявалі мяч, рабілі шмат перадач адзін аднаму, словам, гулялі ў стылі «Барселоны». Тым больш што саміх «барселонцаў» у стартавым складзе налічвалася шэсць чалавек.

Зборная Германіі пачала вялікімі сіламі атакаваць толькі пасля прапушчанага ад Пуёля галявога ўдару. Але гэтыя атакі яскрава паказалі, як хутка гэтая каманда трапіла ў залежнасць ад Мюлера. Таго самага Петэра Мюлера, імя якога год таму не было вядома амаль нікому. Паўабаронца «Баварыі» не згуляў супраць іспанцаў з-за дыскваліфікацыі, а яго партнёры так і не змаглі прабіць Касільяса. Ды і, шчыра прызнацца, галкіпер пірынейцаў нават не ўступаў у гульню. Што такое для элітнага гульца два нямоцныя ўдары ў створ!

Нямецкая казка скончылася, іспанская набліжаецца да кульмінацыі. Ці змогуць чэмпіёны Еўропы стаць яшчэ і чэмпіёнамі свету? А можа ўпершыню наймацнейшымі на планеце стануць галандцы? За спінай — 62 непаўторныя гульні XIX чэмпіянату свету. Але наперадзе — самае цікавае!

**Яўген ВАРАКСА.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.49 | 21.40 | 16.51 |
| Віцебск — | 4.31 | 21.37 | 17.06 |
| Магілёў — | 4.39 | 21.30 | 16.51 |
| Гомель — | 4.45 | 21.17 | 16.32 |
| Гродна — | 5.06 | 21.53 | 16.47 |
| Брэст — | 5.16 | 21.45 | 16.29 |

**Месяц**

*Маладзік 11 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

**Імяніны**

**Пр.** *Георгія, Давыда, Дзяніса, Івана, Ціхана.*

**К.** *Веранікі, Зянона, Мікалая.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 9 ліпеня

Дзве даты

**1912 год** — нарадзіўся (вёска Коласаўшчына, сёння Капыльскі раён) Сяргей Астрэйка, беларускі паэт. Вершы пачаў пісаць у дзяцінстве. Паэтычныя здольнасці юнака першым ацаніў Цішка Гартны. У 1928 годзе вершы 16-гадовага паэта з'явіліся на старонках газеты «Чырвоная змена». У 1933 годзе быў арыштаваны органамі ДПУ БССР па справе «Беларускай народнай Грамады» і высланы ў г. Ірбіт Свярдлоўскай вобласці. У ссылцы зрабіў пераклад «Яўгенія Анегіна» А. Пушкіна (рукапіс не захаваўся). Тэрмін ссылкі яшчэ не скончыўся, калі 14 жніўня 1937 года паэта зноў арыштавалі. 13 верасня 1937-га быў вынесены смяротны прысуд, на наступны дзень (14.9.1937) С. Астрэйку расстралялі. Рэабілітаваны ў 1956-м. З-за арышту не ўбачылі свет яго паэма «Бенгалія» і першы паэтычны зборнік «Смарагды кроз», які, па ўспамінах С. Грахоўскага, высока ацаніў Я. Купала.



**1939 год** — Уінстан Чэрчыль заклікаў англійскі ўрад неадкладна заключыць ваенны саюз з СССР.

Цытата дня:

***«Тыя, у каго мы вучымся, называюцца настаўнікамі, але не кожны, хто вучыць нас, заслугоўвае гэта імя».***

**Іаган Вольфганг Гётэ (1749—1832), нямецкі паэт.**

Белгазпромбанк

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк» — уполномоченный банк ОАО «Газпром» в Республике Беларусь

**Победитель республиканского конкурса «Лучший предприниматель»**

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, тел. 229 16 16 (администратор)
www.belgazprombank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г. ОАО «БЕЛГАЗПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 71 103,1 | 57 588,3 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | | 77 326,0 | 53 419,4 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 172 853,8 | 203 751,8 |
| | для торговли | 11031 | | 90 060,7 | 19 729,6 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | | 82 793,1 | 184 022,2 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | | 297 686,1 | 56 673,3 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 369 262,8 | 1 101 260,2 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | | 45,9 | 45,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | | 75 255,1 | 48 232,7 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | | 74 784,8 | 19 113,7 |
| **10** | **Итого активы** | **110** | | **2 138 317,6** | **1 540 085,3** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | | 10 391,6 | 35 120,6 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | | 396 126,6 | 478 523,5 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | | 971 751,0 | 649 398,1 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 171 217,2 | 48 144,3 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | | 16 090,4 | 29 724,8 |
| 17 | Всего обязательства | 120 | | 1 565 576,8 | 1 240 911,3 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | | 426 268,8 | 218 593,8 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 23 015,6 | 19 623,4 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | | 110 492,7 | 50 562,0 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | | 12 963,7 | 10 394,8 |
| 24 | Всего капитал | 121 | | 572 740,8 | 299 174,0 |
| **25** | **Итого обязательства и капитал** | **12** | | **2 138 317,6** | **1 540 085,3** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | | 2 073 744,7 | 1 550 380,1 |
| 28 | Обязательства | 1302 | | 842 663,9 | 524 930,1 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г. ОАО «БЕЛГАЗПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 161 032,1 | 109 086,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 63 370,8 | 64 066,8 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 97 661,3 | 45 020,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 30 822,7 | 24 477,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 9 244,7 | 6 183,7 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 21 578,0 | 18 293,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | | 10 258,2 | 11 368,0 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 4 659,7 | 1 608,3 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 2,5 | 168,6 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | | 19 629,5 | 8 185,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | | 30 364,2 | 22 467,8 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | | 54 552,8 | 44 147,5 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | | 21 536,7 | 9 991,1 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 15 701,1 | 6 114,5 |
| **15** | **Прибыль (убыток)** | **2** | | **53 103,8** | **30 488,0** |

**Заместитель Председателя Правления** **С.М. Добролет**

**Главный бухгалтер** **Т.М. Пивовар**

**Дата подписания: 06 июля 2010 г.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 27.10.2006 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.*

## САМАЛЁТ НА СОНЕЧНЫХ БАТАРЭЯХ ЗАВЯРШЫЎ ПЕРШЫ КРУГЛАСУТАЧНЫ ПАЛЁТ

Самалёт на сонечных батарэях Solar Impulse завяршыў свой палёт, які доўжыўся больш як суткі, і прызямліўся непадалёку ад швейцарскага горада Паерн. Унікальны апарат узляцеў 7 ліпеня і на працягу дня паступова набіраў вышыню, бесперапынна зараджаючы 12 тыс. сонечных батарэй. Самалёт правёў у паветры ўсю ноч, выкарыстоўваючы сонечную энергію, назапашаную за дзень у батарэях.



Фота Сіньхуа-БЕЛТА.

## Так мука патрэбна, што вартаўніка забілі

У стане алкагольнага ап'янення позна ўвечары два жыхары вёскі Васільеўка Добрушскага раёна залезлі на тэрыторыю малочнатаварнай фермы ПУП «Цэрахоўка-агра». Падчас крадзяжу кармавой мукі грамадзяне (аднаму — 23, другому — 17 гадоў) збілі і ўдарылі каменем вартаўніка фермы, 58-гадовага мясцовага жыхара. Мужчына памёр праз тыдзень ад атрыманых траўмаў галавы. Заведзена крымінальная справа.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»
- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
- Шэнгенскія візы
(029) 677 00 46 www.h-t.by

## СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | | | 3 | | 8 | | 9 | |
| | | | | 7 | | | | 4 |
| | | | 9 | 5 | | | | 2 |
| | 3 | 2 | 8 | | | 7 | | 5 |
| | | 7 | 4 | | | | | |
| | | 6 | 7 | 3 | | 2 | | 8 |
| | 6 | 9 | | | | 4 | | |
| | 5 | | | | | 9 | | |
| 8 | | 4 | | | 9 | | 5 | |

**СУДОКУ.** У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

# КЛЮЧАВАЯ «ПОСТАЦЬ» НА ВЯСЕЛЛІ

Свет і космас чалавека

**Народны досвед перасцерагаў: таго, хто ўдзельнічаў у найважнейшых рытуалах пахавальнага абраду, больш ніколі не запрашалі быць ключавой постаццю на вяселлі — сватамі. У бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мы пазнаёміліся з мілай супрацоўніцай, жанчынай сярэдніх гадоў, якая распавяла нам, што добра ведае традыцыі беларускага вяселля, што шмат гадоў яе запрашалі на імпрэзы ў якасці дасведчанай свахі. Але потым яна расплакалася і сказала, што ёй вельмі шкада, таму што больш яна не зможа дапамагаць маладым людзям, бо нядаўна пахавала мужа. А народны этыкет і ўласная свядомасць забараняе ёй у далейшым выконваць гэту галоўную ролю на вяселлі.**

- Сёння практычна цалкам згублена асноўная функцыя свата і свахі — сватаць маладых людзей. Але, як і раней, на вяселлі прысутнічаюць людзі, якіх перавязваюць ручнікамі і ўмоўна завуць сватамі. Абапіраючыся на вопыт продкаў, адзначым, што пары сватаў былі як з боку нявесты, так і з боку жаніха.
- У некаторых рэгіёнах на вяселлі было чатыры пары сватаў. Лічыце самі: хросны бацька з жонкай і хросная маці з мужам з боку нявесты, хросны бацька з жонкай і хросная маці з мужам з боку жаніха.
- Хочацца і сёння параіць выбіраць у сваты шлюбныя пары з кожнага боку, не дапускаючы, першым чынам іх рытуальнага падзелу. Гаворка ідзе пра сучасную ці «гарадскую» традыцыю, калі сваццю выбіраюць з боку нявесты, а свата — з боку жаніха.
- Завязваючы ручнікі сватам, успомніце пра сімволіку правага (мужчынскага) і левага (жаночага) у абрадавым полі беларускай традыцыйнай культуры. Такім чынам, ручнік свату завязваюць праз левае плячо пад правую руку, а свацці, наадварот, праз правае плячо пад левую руку. Ніякія ружовыя, блакітныя стужачкі з надпісамі, як у выпускнікоў школ, не могуць замяніць традыцыйных вясельных ручнікоў!

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Жонка з дзецьмі з'язджаюць на дачу. Пачынаецца шчаслівае, але галоднае лета...**

☺

Адэса:

— Божа мой, каго я бачу! Саламон Майсеевіч!

— Мяне завуць Саламон Марковіч.

— Вы мне будзеце расказваць, як вас завуць?! Я вашага тату з дзяцінства ведаў! Ён быў такім прыгожым, кучаравым!

— Нічога падобнага. Мой тата быў маленькі і лысы.

— Ай, ідзіце да чорта, вы не ведаеце свайго тату!

☺

**Аб'ява:**

**«Глуханямы ігрок на вувузеле прыструніць вашых шумных суседзяў. Вынік гарантую!»**

☺

— Учора вазіў дачку ў вёску, паказваў казла.

— Навошта?

— Каб ведала, як выглядае сапраўдны казёл. А то яна яго толькі са слоў маці няправільна ўяўляе.

☺

**Спякота — гэта калі ты прыціскаешся да дзяўчыны ў грамадскім транспарце не таму што яна сімпатычная, а таму, што ў яе ў пакеце замарожаная курыца.**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычная — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3310. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12